ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 Г.
№ 21 (889) 23 — 29 МАЯ 2009 Г.

# КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

С. 6

С. 4

С. 13

С. 14

## ХТО НА НОВЕНЬКАГА?

**Пастаўленае пытанне і героі першай паласы — не выпадковыя. 27 мая на базе Тэатра беларускай драматургіі пройдзе выязная калегія Міністэрства культуры нашай краіны, дзе першым пунктам будзе разглядацца праца з творчай моладдзю ў рэспубліканскіх драматычных тэатрах, што пацвярджае актуальнасць абранай праблемы. І сёлетнія выпускнікі тэатральнага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (на здымку) — з тых, хто неўзабаве па размеркаванні папоўніць шэрагі айчынных сцэнічных калектываў. Урэшце, тэму моладзі, якая шукае сябе ў прафесіі, мы працягваем у матэрыялах гэтага нумара.**

С. 5

Фота Юрыя ІВАНОВА

# Учора апладзіравалі Магілёўшчыне

**У дзень, калі нумар здаваўся ў друк, магілёўская дэлегацыя вяла мантаж выстаўкі “Сучаснае мастацтва Магілёўшчыны” ў галерэі “Універсітэт культуры”. Адкрыццё яе і сам справаздачны канцэрт творцаў гэтай вобласці адбыліся 22 мая.**

**На выстаўцы прадстаўлены 50 твораў, пераважна нацюрмортаў, партрэтаў, пейзажаў, напісаных майстрамі пэндзля рэгіёна, у асноўным, цягам апошніх трох гадоў.**

**Пра гэтую падзею падрабязна мы паведамім у наступным нумары. А сёння, па традыцыі, інфармуем пра маючую адбыцца ўжо 27-га: у Палацы Рэспублікі Віцебшчына завяршае гадавы цыкл творчых справаздач абласцей, прымеркаваных да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Як паведаміла “К” намеснік начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Ларыса Аленская, канцэрт, паводле традыцыі гэтых мерапрыемстваў, будзе складацца з некалькіх блокаў. Першы распавядзе пра вытокі духоўнасці на Беларускім Паазер’і. Для адлюстравання гісторыка-культурнай адметнасці старадаўняй віцебскай зямлі мяркуецца выкарыстаць і класічную, і сучасную музыку. Вакальныя, харавыя, харэаграфічныя і інструментальныя калектывы адзінай сцэнічнай дзеяй звяжуць мінулае з сучаснасцю.

Другі блок — фальклорны: на своеасаблівым віцебскім кірмашы збяруцца лепшыя самадзейныя гурты і выканаўцы вобласці.

Асобнае месца ў справаздачным канцэрце зойме тэма Вялікай Айчыннай вайны. А апошні блок прысвечаны Віцебску мастацкаму — ад часін Марка Шагала да сучаснага “Славянскага базару”.

У канцэрце прымуць удзел як прафесійныя філарманічныя калектывы, так і заслужаныя аматарскія з кожнага рэгіёна Віцебскай вобласці.

А ў фае Палаца Рэспублікі будзе ладзіцца выстаўка твораў амаль сотні майстроў народнай творчасці з раённых дамоў рамёстваў.

**Андрэй СТАРЖЫНСКІ**

**На здымку: вядзецца мантаж выстаўкі магілёўскіх мастакоў. Фота Юрыя ІВАНОВА**

**21 мая ў Нацыянальным гісторыка-культурным запаведніку “Нясвіж” быў адкрыты спецыяльны інфармацыйны тэрмінал. Як паведаміла “К” намеснік дырэктара музея-запаведніка па навуковай працы Галіна Кандрацьева, дзейнічаць ён пачаў у першым пускавым комплексе палацавага ансамбля.**

# Да Радзівілаў — праз тэрмінал

Інфармацыйны тэрмінал распрацаваны пры ўдзеле і фінансавай падтрымцы маскоўскага Бюро UNESCO па Беларусі, Расіі, Азербайджане, Арменіі, Малдове, а таксама пры ўдзеле Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах UNESCO.

Унікальны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс уключае комплекс звестак па гісторыі Нясвіжскага архітэктурна-культурнага ансамбля, роду Радзівілаў, іншыя цікавыя факты, якія не могуць не прывабіць турыстаў і экскурсантаў.

Тэрмінал паспрыяе і захаванню, распаўсюджванню інфармацыі пра беларускую культурна-гістарычную спадчыну, яе ідэнтыфікацыі ў глабальнай медыяпрасторы. Яшчэ адна мэта ноў-хаў — візуальная прэзентацыя архіўных каштоўнасцей і музейных калекцый, папулярызацыя гістарычных мастацкіх традыцый і тэхналогій...

Да паслуг карыстальнікаў — сем тэрмінальных раздзелаў. “Горад” паведамляе пра лёс і цікавосткі Нясвіжа. Аб узвядзенні і развіцці нясвіжскай перліны распавядае “Замак”. Раздзел “Радзівілы” ўтрымлівае візуальныя і тэкставыя звесткі пра славуты род. “Архіў” запрашае да агляду шматлікіх дакументаў. Заўзятыя кніжнікі не абмінуць “Бібліятэку”. Аб экскурсійных аб’ектах Нясвіжа і адукацыйных рэсурсах музея-запаведніка расказвае раздзел “Наведвальнікам”. А “Новыя паступленні” паведамяць пра музейныя прадметы з мясцовых музейных фондаў.

**А.С.**

**На здымку: у час урачыстага адкрыцця інфармацыйнага тэрмінала ў Нясвіжскім замку.**

# Комплексны падыход да гісторыі

**Тэма захавання помнікаў гісторыі і культуры Беларусі ўзнімалася пад час пасяджэння “круглага стала” ў Прэс-цэнтры Дома прэсы з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства культуры, упраўленняў культуры Мінаблвыканкама і Мінгарвыканкама.**

Найбольш актыўна абмяркоўваліся пытанні фінансавання аб’ектаў, унесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. У прыватнасці, загадчыца сектара аховы гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Наталля Хвір зазначыла, што да 2010 года за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту плануецца ажыццявіць фінансаванне рэстаўрацыйных работ помнікаў архітэктуры з іх далейшым уключэннем у сферу актыўнай турыстычнай дзейнасці.

Сёлета ў межах Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы плануецца аднаўленне палацавага комплексу ў Косаве, сядзібы ў вёсцы Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна, комплексу былога езуіцкага калегіума ў вёсцы Юравічы Калінкавіцкага раёна, на што выдаткавана больш за тры мільярды рублёў. Апрача таго, па словах Наталлі Хвір, у рэспубліцы актыўна вядзецца падрыхтоўка да складання дасье на ўключэнне шэрагу аб’ектаў у Спіс сусветнай спадчыны UNESCO. Вялікая ўвага нададзена нематэрыяльным каштоўнасцям, якіх на сённяшні дзень у краіне налічваецца 56.

Пад час абмеркавання актуальных пытанняў закранаўся аспект супрацоўніцтва і з прыватнымі інвестарамі. Як паведаміла супрацоўніца Міністэрства культуры, усе вобласці краіны ўжо вызначыліся з шэрагам аб’ектаў, якія могуць быць набыты як айчыннымі, так і замежнымі грамадзянамі для наступнай рэстаўрацыі і выкарыстання ў сферы аграгурызму, а да 1 жніўня гэты спіс мусіць быць даступны грамадскасці.

Шэраг мерапрыемстваў запланаваны да Года роднай зямлі. У прыватнасці, сёлета вялікая ўвага надаецца дагляду за брацкімі магіламі воінаў Вялікай Айчыннай вайны. Па словах галоўнага спецыяліста ўпраўлення культуры Мінскага гарвыканкама Наталлі Радчанка, з 91 памятнага знака, помніка і месца баявой славы гадоў Вялікай Айчыннай вайны, пахаванняў воінаў і партызан 26 аб’ектаў горада патрабуюць узнаўлення альбо замены шыльд з унясеннем вядомых імёнаў воінаў, частковай або поўнай замены мармуровых пліт на мемарыялах, добраўпарадкавання прылеглай тэрыторыі. За кошт сродкаў гарадскога бюджэту гэтымі пытаннямі актыўна займаюцца мясцовыя камунальныя службы.

Апрача гэтага, у Мінску ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца Комплексная праграма па рэканструкцыі, рэстаўрацыі, узнаўленні і добраўпарадкаванні гістарычнага цэнтра горада на 2004 — 2010 гады. Як паведаміла Наталля Радчанка, за 2008 год на гэтыя мэты было асвоена 105,83 млрд. рублёў, а за першы квартал гэтага — ужо 21,5 млрд.

**Кастусь АНТАНОВІЧ**

# Карэя ў Мастацкім і чайная цырымонія

**19 мая кіраўнікі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага музея этнаграфіі Рэспублікі Карэя падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве.**

Як паведаміла “К” загадчык аддзела замежнага мастацтва Алена Сянькевіч, дакумент быў падпісаны дырэктарам Дзяржаўнага музея этнаграфіі Рэспублікі Карэя Сін Кван Сопам і дырэктарам нашага Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімірам Пракапцовым. Пагадненне прадугледжвае абмен супрацоўнікамі, сумесныя палявыя і навукова-тэарэтычныя даследаванні, працу па выставачных і адукацыйных праектах, а таксама абмен навуковай інфармацыяй і публікацыямі.

А напярэдадні, 18 мая, у Мінску адкрылася выстаўка “Традыцыйнае мастацтва Карэі”, якая была арганізавана па ініцыятыве Пасольства Рэспублікі Карэя ў Рэспубліцы Беларусь і Нацыянальнага мастацкага музея пры непасрэдным удзеле Дзяржаўнага музея этнаграфіі азіяцкай краіны.

На выстаўцы, якая прадоўжыцца да канца ліпеня, прадстаўлены каля 30 твораў жывапісу, скульптуры і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Экспанаты перададзены ў падарунак Нацыянальнаму мастацкаму музею Беларусі Дзяржаўным музеем этнаграфіі Рэспублікі Карэя. Гэта копіі з класічных твораў карэйскага мастацтва, а таксама работы сучасных народных майстроў. Падораныя рэчы, як паведаміла Алена Сянькевіч, пасля закрыцця выстаўкі мяркуюць змясціць у пастаяннай экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея ў зале Усходу.

Дарэчы, 19 мая ў Доме дружбы была наладжана сапраўдная чайная цырымонія па-карэйску.

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ**

# Традыцыі і фонды

**18 мая Музей старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адзначыў сваё 30-годдзе. З гэтай нагоды ў музейных залах адбыліся юбілейныя ўрачыстасці і адкрыццё выстаўкі “З крыніц адвечнай прыгажосці”, складзенай з дзвюх экспазіцый; “Традыцыйны строй, традыцыйны тэкстыль Бярэзіншчыны” і “Творы жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з фондаў Музея старажытнабеларускай культуры”. У экспазіцыю ўвайшлі і новыя унікальныя прадметы.**

На цырымоніі адкрыцця выстаўкі прысутнічалі дырэктар Інстытута, член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар Аляксандр Лакотка і супрацоўнікі ўстановы, дырэктар музея Барыс Лазука, вядомыя мастацтвазнаўцы, дзеячы культуры.

Новая выстаўка “Традыцыйны строй, традыцыйны тэкстыль Бярэзіншчыны” адкрывае рэгіён, які не быў да гэтага дастаткова вывучаны. Калекцыя адзення сабрана дзякуючы ахвяраванням жыхароў Бярэзінскага раёна. У экспазіцыі можна таксама пабачыць фотаздымкі 1905 года вядомага этнографа Вячаслава Косткі, які адлюстраваў строі насельнікаў краю. Выстаўка фарміравалася на працягу шасці гадоў. “Дзякуючы сабранаму матэрыялу, — адзначыла мастацтвазнаўца Марыя Віннікава, — нам удалося дакладна паказаць касцюм Бярэзіншчыны, у тым ліку такі традыцыйны галаўны ўбор беларусаў, як намітка”.

У трэцім па велічыні музеі гісторыі мастацтва краіны сёння знаходзіцца больш за 30 тысяч прадметаў.

**Наталля КІРПІЧЭНКАВА**

**Фота Юрыя ІВАНОВА**

# “... Critica” ад Героя

**20 мая ў галерэі “Лабірынт” Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася перадача кубінскіх кніг. У акцыі прынялі ўдзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Куба ў Рэспубліцы Беларусь Амар Сенон Медзіна Кінтэра, прадстаўнікі іншых замежных дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Беларусі.**

Ва ўрачыстай абстаноўцы Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Куба перадаў у дар НББ збор твораў “Edicion Critica” (“Крытычнае Выданне”) нацыянальнага героя Кубы Хасэ Марці.

Сабраныя ў гэтым выданні арыгіналы рукапісаў, якія былі супастаўлены з першымі публікацыямі экспертамі, што ведаюць не толькі працы, але і почырк Марці.

Збор твораў Хасэ Марці ўключае як рукапісы, так і друкаваны матэрыял: хронікі, журналісцкую карэспандэнцыю, артыкулы, зваротыкароткую бібліяграфічную характарыстыку, паэмы, навелы, тэатральныя творы, лісты, публічныя прамовы, пісьмовыя паведамленні, маніфесты, прысвячэнні, чарнавікі, сшыткі для нататак, фрагменты сачыненняў, анатацыі, пераклады і малюнкі.

**Н.К.**

**Аб’ява***

**Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў аб’яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:**

**— загадчык кафедры фізвыхавання;**

**— дацэнт кафедры рэжысуры;**

**— прафесар кафедры графікі;**

**— прафесар кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва;**

**— старшы выкладчык кафедры малюнка, жывапісу, скульптуры;**

**— старшы выкладчык на 0,75 стаўкі кафедры гуманітарных дысцыплін;**

**— старшы выкладчык кафедры сцэнічнай мовы і вакалу.**

*Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб’явы. Заявы і дакументы, згодна з Палажэннем аб конкурсе, падаваць на імя рэктара Акадэміі на адрас:*

***220012, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 81, аддзел кадраў; тэлефон: 292-77-34.***

УНП 100289132

Сітуацыя

# Каб не знік унікальны фарфор

## Які лёс калекцый зачыненых музеяў?

**У дзень вёрсткі нумара ў рэдакцыю “К” звярнуліся ўсхваляваныя мастакі. Падставы для хваляванняў аказаліся больш чым сур’ёзнымі: спыняе існаванне музей Мінскага фарфоравага завода, пра слынную гісторыю і мастацкія здабыткі якога наша газета пісала неаднаразова. Які лёс чакае унікальныя экспанаты, што здавён паспелі стаць нацыянальным набыткам? Мы даведаліся, што адказ на гэтае пытанне непакоіць дырэктара Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі Сяргея Вечара. Натуральна, ён як кіраўнік аднаго з вядучых музеяў імкнецца якасна папоўніць калекцыю фарфору сваёй установы. Кіраўніцтва завода, як аказалася, ідзе насустрач.**

— Рэарганізуецца завод, ліквідуецца ягоны музей, — распавядае “К” Сяргей Вечар, — а гэта — багацейшая калекцыя: велікодныя яйкі, вазы, сервізы, скульптуры... Работы з 1950-х гадоў і амаль да сённяшніх дзён. Прадстаўлена ўся палітра лепшых мастакоў-керамістаў Беларусі: гэта Аляксей Фядусь, Вікторыя Данчук, Валерый Леантовіч, Ганна Літвіненка і іншыя. Апрача аўтарскіх работ, ёсць і эталонныя ўзоры прамысловых фарфоравых вырабаў. Рарытэты!.. Мы накіравалі афіцыйны ліст на завод. Кіраўніцтва пайшло насустрач. На прадпрыемства выехала загадчык аддзела фондаў нашага музея Марына Казанцава. За месяц ёю быў складзены пералік твораў, якія ўяўляюць музейны інтарэс і вартыя таго, каб застацца ў Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь. У пераліку — звыш 7 тысяч адзінак... Зараз пытанне аб перадачы іх у наш музей знаходзіцца ў стадыі вырашэння. Ніхто не адмаўляе, і я спадзяюся, што ўсё атрымаецца.

У гаворцы з Сяргеем Вечарам высветлілася тое, што апрача музея фарфоравы завод мае і дэманстрацыйную залу. Аўтарскія работы спачатку траплялі сюды, а праз пэўны час — у музей. З прычыны пэўных абставін цягам апошніх гадоў гэты працэс быў спынены, і творы з залы ў заводскі музей не пераводзіліся. Таму асобныя рэчы музейнага значэння засталіся ў дэманстрацыйнай зале. “Ейны лёс, — распавядае Сяргей Вечар, — нас таксама вельмі хвалюе, бо гэта — суцэльная калекцыя, якую не варта разбіваць. Тым больш, што нашы калегі з Нацыянальнага мастацкага музея ў свой час адабралі пэўную колькасць экспанатаў, перададзеных заводам ім без перашкод”. Словам, засталася яшчэ не адна сотня “дэманстрацыйных” вырабаў з фарфору. Ім патрэбны адзіны і сталы гаспадар. Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, што ажыццяўляе новую канцэпцыю музейнай дзейнасці, гатовы стаць такім гаспадаром. Унікальны фарфор будзе выкарыстаны ў выставачнай рабоце, прадставяць яго і ў будучай экспазіцыі, а таксама ў сістэме адкрытага захавання фондавых калекцый...

* * *

Лакальная праблема, агучаная Сяргеем Вечарам, мае больш шырокі аспект. Паўсюль ствараюцца музеі, якія не ўваходзяць у сістэму Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Справа выдатная. Але пры закрыцці такіх устаноў — ведамасных, дзяржаўных і прыватных — далейшы лёс экспанатаў прасачыць вельмі цяжка. “Мы нядаўна хацелі наведаць музей пры Барысаўскім шклозаводзе, — расказвае дырэктар Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, — а ён, аказваецца, не працуе ўжо! А дзе экспанаты, якія таксама з’яўляюцца нацыянальнай мастацкай спадчынай? Я асабіста не ведаю!”

Цалкам пагаджаемся з Сяргеем Уладзіміравічам: праблема ўзнята выключна важная. У бліжэйшых нумарах “Культура” вернецца да яе з больш дэталёвым і глыбокім разглядам.

**Яўген РАГІН**

# Ён заўсёды быў блізкім...

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні родным, блізкім і калегам народнага артыста Савецкага Саюза Алега Янкоўскага ў сувязі з яго смерцю. Пра гэта паведаміла Прэс-служба Кіраўніка дзяржавы.**

**“Алег Янкоўскі навечна ўвайшоў у гісторыю як легендарны майстар тэатра і кіно, чалавек выдатнага таленту і шырокай душы, чыя дзейнасць пакінула яркі след у савецкім, рускім і сусветным мастацтве, — гаворыцца ў спачуванні. — Для нашай краіны Алег Іванавіч заўсёды быў блізкім, родным чалавекам, які ўнёс значны ўклад у развіццё нацыянальнага кінематографа і ўмацаванне культурных сувязей брацкіх народаў. Яго смерць стала незаменнай стратай для ўсіх беларусаў”.**

Мінск. “Лістапад-2001”. Фота Віктара ЗАЙКОЎСКАГА

...Мінск. Позняя восень 2001-га. Народны артыст СССР Алег Янкоўскі прывозіць на кінафестываль “Лістапад” сваю першую і, як зразумела цяпер, апошнюю рэжысёрскую работу — “Прыходзь на мяне паглядзець”. Простае кіно, простая гісторыя... Але як жа адгукнуліся на яе беларускія гледачы, як закранула яна нашы сэрцы! Як сагрэла ўсіх нас! Можа, таму, што мінчане з асаблівым пачуццём глядзелі гэты фільм: Алег Янкоўскі ніколі не ўспрымаўся намі як проста любімы акцёр — Мінск быў адным з галоўных гарадоў у ягоным жыцці і заўсёды сустракаў артыста як роднага чалавека. Гэта ўжо потым былі — “Шчыт і меч”, “Служылі два таварышы”, рэпетыцыі і трыумфы легендарнага “Ленкома”, Канны і Таркоўскі. Але спачатку была сцэна Драматычнага тэатра імя М.Горкага на вуліцы Валадарскага ў беларускай сталіцы і невялікая роля піянера ў спектаклі, дзе іграў старэйшы брат Расціслаў...

Сімвалічна, што менавіта на мінскім “Лістападзе” ў 2004-м Алег Янкоўскі быў узнагароджаны спецпрызам Прэзідэнта Беларусі “За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве”...

Быў у жыцці Алега Янкоўскага і “Беларусьфільм”. Якраз у самыя першыя, самыя цяжкія для маладога акцёра гады станаўлення ў прафесіі — “Чакай мяне, Ганна” Валянціна Вінагарадава, “Я, Францыск Скарына” Барыса Сцяпанава. Роля ў апошнім стала пакуль адзіным увасабленнем вобраза першадрукара славянскага свету на кінаэкране.

Былі і іншыя ролі, сыграныя ўжо на іншых студыях, у іншых тэатрах. Калі пачынаеш іх успамінаць, то становіцца зразумела: эпоха ў айчыннym і сусветным мастацтве прайшла пад знакам Алега Янкоўскага. Як шмат ён сыграў! Як мала ён сыграў...

І яшчэ. У Мінску была яго першая сцэна, а, як кажуць у тэатры, першая сцэна назаўсёды застаецца галоўнай...

**Рэдакцыя газеты “Культура” выказвае шчырыя спачуванні народнаму артысту СССР і Беларусі Расіславу Іванавічу Янкоўскаму ў сувязі са смерцю брата — народнага артыста СССР Алега ЯНКОЎСКАГА.**

# Да кінапсіхалагізму

**Беларускія кінатворцы пашыраюць сваю сучасную жанравую палітру. 26 мая ў сталічным Доме кіно адбудзецца прэм’ера новай псіхалагічнай драмы “Інсайт”.**

Фільм зняты на Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм” рэжысёрам Рэнатай Грыцковай. Чакаецца, што стужку прадставіць творчая група на чале з выканаўцам галоўнай ролі, народным артыстам СССР і Украіны Багданам Ступкай.

Як лічыць рэжысёр, назва стужкі цалкам адпавядае ідэйнаму зместу карціны. “Insight” у перакладзе з англійскай мовы — “пранікненне ў сутнасць нейкай сітуацыі або справы”. Беларускі “Інсайт” — гэта сучасная драма пра жанчыну.

Ролю Ганны выконвае народная артыстка Расіі Ірына Разанава, а ролю пацыента — старога, якому засталося жыць некалькі месяцаў, — Багдан Ступка. Астатнія ролі выканалі беларускія акцёры Уладзімір Мішчанчук, Анатоль Цярпіцкі, Аксана Лясная, Вольга Няфёдава, а таксама Вольга Іванова і Аляксей Шэдзько, якія іграюць галоўных герояў у рэтра-сцэнах.

**С.А.**

# “Ваўкі” — увосень

**На Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм” поўным ходам ідзе праца над стужкай Алясандра Колбышава “Ваўкі”. Ужо завершана большая частка здымачнага перыяду, наперадзе — мантаж і агучванне. Прэм’ера запланавана на гэтую восень.**

Падзеі стужкі адбываюцца адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны ў невялікай, занесенай снегам беларускай вёсцы. Мерны лад жыцця мясцовых жыхароў перарывае з’яўленне дзіўнага незнаёмца. Ён аказваецца ўцекачом з лагера, па чыім следзе ідзе капітан дзяржбяспекі. Перад вяскоўцамі паўстае складанае маральнае пытанне: выдаць небараку ўладам ці схаваць яго ў сябе?..

Сцэнарый “Ваўкоў” створаны паводле аповесці, напісанай яшчэ сорак гадоў таму вядомым беларускім рэжысёрам і сцэнарыстам Аляксандрам Чакмянёвым. А рэжысура даверана Аляксандру Колбышаву, для якога гэты фільм будзе дэбютам у поўнаметражным кіно. Праўда, назваць рэжысёра пачаткоўцам нельга: у 1999 годзе яго кароткаметражная работа “Прага да жыцця” была прызнана лепшай на Нацыянальным кінафестывалі ў Брэсце.

У новай стужцы здымаюцца як беларускія (Уладзімір Гасцюхін, Аксана Лясная), так і расійскія акцёры (Андрэй Панін, Дзмітрый Ульянаў).

Юрыдычныя тонкасці (elegantia juris)

kultura@tut.by

**Добры дзень, паважаная рэдакцыя!**

**Я працую выкладчыкам у дзіцячай школе мастацтваў. Аб’ём маёй асноўнай нагрузкі складае 36 гадзін на тыдзень. Ці маю я права працаваць па сумяшчальніцтве кіраўніком самадзейнага дзіцячага ўзорнага калектыву ў гэтай жа школе?**

**На пытанне адказвае начальнік юрыдычнага аддзела Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Алена ВЕШТАРТ:**

— Праца на ўмовах сумяшчальніцтва рэгулюецца Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь (артыкулы 343 — 351, 255), законамі Рэспублікі Беларусь “Аб барацьбе з карупцыяй”, “Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь”. Некаторыя пытанні аплаты працы педагагічных работнікаў, у тым ліку пры рабоце па сумяшчальніцтве, адлюстраваны ў пісьме Міністэрства адукацыі ад 27 лютага 2007 г. № 11-02-18/512дс.

Сумяшчальніцтва — гэта выкананне работнікам у вольны ад асноўнай працы час іншай пастаянна аплачваемай работы ў таго ж ці ў іншага наймальніка на ўмовах працоўнага дагавора, заключанага ў адпаведнасці з заканадаўствам. Пры гэтым працягласць рабочага часу, які ўстанаўліваецца наймальнікам для тых, хто працуе па сумяшчальніцтве, не можа перавышаць палову нармальнай працягласці рабочага часу. Аплата працы тых, хто працуе па сумяшчальніцтве, ажыццяўляецца прапарцыянальна адпрацаванаму часу.

Выкладчыцкая праца можа выконвацца на ўмовах сумяшчальніцтва пры ўмове, калі яна ажыццяўляецца не ва ўрон асноўнай рабоце. Гэтая работа выконваецца за межамі рабочага часу па асноўнай працы і не болей за палову ўстаноўленай нормы за стаўку.

Настаўнікам (выкладчыкам) кіраўнікам гурткоў (калектываў) устаноўлена скарочаная працягласць працоўнага часу не болей за 36 гадзін на тыдзень і нормы выкладчыцкай работы за стаўку 18 гадзін на тыдзень (720 гадзін у год) (пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 1 верасня 2003 г. № 1134). Калі пазначаныя педагагічныя работнікі выконваюць работу за іх настаўніка (выкладчыка), які часова адсутнічае, дык аплата іх працы ажыццяўляецца ў межах устаноўленай скарочанай працягласці рабочага часу (36 гадзін на тыдзень) па гадзінных стаўках за фактычна праведзеныя гадзіны. Гэтыя работнікі могуць таксама выконваць работу па іншай пасадзе на ўмовах сумяшчальніцтва.

Такім чынам, настаўнік дзіцячай школы мастацтваў у вольны ад асноўнай працы час можа працаваць па сумяшчальніцтве, як у сваёй школе, так і ў іншага наймальніка, кіраўніком гуртка (калектыву) да 9 гадзін на тыдзень.

Разам з тым, неабходна ўлічваць, што выкананне работы па сумяшчальніцтве ажыццяўляецца на падставе працоўнага дагавора, а заключэнне працоўнага дагавора — гэта права наймальніка.

# Новая ў “...традыцыях славян”

**Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь увёў у абарачэнне памятныя манеты “Хрэсьбіны” серыі “Сямейныя традыцыі славян”: сярэбраную — наміналам 20 рублёў, і медна-нікелевую — наміналам 1 рубель.**

Манеты маюць форму круга, з пярэдняга і адваротнага бакоў — выступаючы кант па акружнасці. Бакавая паверхня манет — рыфлёная.

На пярэднім баку манет размешчаны: уверсе — рэльефная выява Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь; у цэнтры — выява бусла, які ўзвышаецца на паўкруглай дэкаратыўнай кампазіцыі (вобраз зямлі-карміцелькі). Кампазіцыя ўключае сімвалы сям’і, мацярынства і сонца; пад ёю ўказаны год чаканкі (на сярэбранай манеце — і проба сплаву) і намінал; у верхняй частцы па крузе — надпіс: “Рэспубліка Беларусь”.

На адваротным баку манет размешчаны: у цэнтры на фоне арнаменту — выява дзіцяці над купеллю ў адзенні для хрышчэння, паверх кашулі якога надзеты крыжык (на сярэбранай манеце ён выкананы метадам тампадрукавання). У верхняй частцы — фігуры двух анёлаў і голуба. У ніжняй частцы манеты па крузе — надпіс: “Хрэсьбіны”.

Сярэбраныя і медна-нікелевыя манеты адчаканены якасцю “брыльянт-анцыркулейтэд”. Тыраж сярэбранай — да 25 000 штук, медна-нікелевай — 5000 штук.

**Паводле паведамлення Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь**

# Інвестыцыі пад імя Шагала,

## або Пяцьдзесят гектараў для турыстычнага паломніцтва

**20 мая праект Міжнароднага Шагалаўскага цэнтра ў Віцебску быў прадстаўлены на Мінскай міжнароднай выстаўцы "Нерухомасць і інвестыцыі". Шпацыруючы ў той самы дзень па ціхай Пакроўскай, патэлефанаваў кіраўніку творчай групы Леаніду Левіну, каб запытаць, ці прыцягвае праект увагу наведвальнікаў. "Цікавасць такая, што ажно перадыхнуць няма як! Да нашага стэнда людзі ідуць несупынна", — паведаміў голас знакамітага архітэктара на фоне звыклай для такіх выставак гаманы.**

**Мэта кароткай экскурсіі, якую правялі для мяне галоўны спецыяліст аддзела культуры Віцебскага гарвыканкама Пётр Падгурскі і дырэктар Музея Марка Шагала Людміла Хмяльніцкая, цалкам зразумелая: уявіць, як будуць выглядаць гэтыя ціхія і непрэзентабельныя пакуль мясціны пасля таго, як грандыёзная задума, натхняльнікам якой стаў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец, увасобіцца ў жыццё.**

**— Ужо на чацвёрты дзень пасля свайго прызначэння на цяперашнюю пасаду Аляксандр Мікалаевіч запрасіў мяне ў свой кабінет і прапанаваў узначаліць творчую групу, — распавёў Леанід Левін. — Я пагадзіўся без ваганняў. Бо няўзброеным вокам відаць: мы не аддаём свайму земляку тую пашану, якой ён заслугоўвае. Шагала ў Віцебску сёння, на жаль, вельмі мала.**

**Неаспрэчна, выбар галоўнага архітэктара быў невыпадковы. Пра гэта сведчаць не столькі рэгаліі Леаніда Левіна, колькі яго "паслужны спіс": у ім можна сустрэць і ўдалую стылізацыю "пад даўніну" (знакамітае Траецкае прадмесце) і смелыя ўзоры сучаснай архітэктуры. Менавіта гэтыя два пачаткі, здавалася б, супрацьлеглыя, і будуць вызначаць канцэптуальнае вырашэнне прасторы Шагалаўскага цэнтра.**

**За лічаныя месяцы група архітэктараў з пяці чалавек стварыла праектную прапанову па рэгенерацыі гістарычнага раёна "Задзвінне", у рэалізацыі якой было вызначана чатыры чаргі. Агульная плошча ўчастка складае 50 гектараў, а сума інвестыцый, патрэбных для ўвасаблення задумы ў жыццё, перавышае 200 млн. долараў. Лічбы ўражваюць!**

### Навошта гэта патрэбна?

Гэтае пытанне ўжо праслізгвае дзенідзе ў СМІ, і гучаць яно будзе яшчэ не аднойчы. Але каб знайсці на яго адказ, трэба проста прыехаць на Пакроўскую і ўбачыць яе на ўласныя вочы.

Абавязковы пункт непісанага пратакола наведвання турыстамі гэтых мясцін — фота ля помніка Шагалу, які стаіць на былой Полацкай плошчы (а цяпер — безыменным лапіку). Фатографу давядзецца праявіць вынаходлівасць, каб у кадр не трапіў непрэзентабельны ангар на заднім плане. Такіх збудаванняў, якія наўрад ці папоўняць спіс помнікаў прамысловага дойлідства, уваколіцах дома Шагала вельмі шмат: тут і вінзавод, і нейкія склады, і аўтарамонтныя майстэрні... Прыкмячаю, што групка замежных турыстаў ахвотна іх фатаграфуе, — маўляў, экзотыка!

Але агульны ландшафт гэтых мясцін за стагоддзе бадай не змяніўся: на шчасце, на Пакроўскай не паўстала "высотак" або тых аб'ектаў, "выкарчаваць" якія сёння было б праблематычна. Парэпаныя паркаваны чаргуюцца тут са старасвецкімі камянічкамі, дзе Шагал, мусіць, ведаў кожную цаглінку. Такіх дамоў у гэтым раёне збераглося нямала: і на Пакроўскай, і на суседняй Рэвалюцыйнай. Яе таксама не абміне ніводзін з тых, хто захоча прайсці сцежкамі мастака. Праўда, услед за зграбнымі неатынкаванымі дамкамі паабапал дарогі ідуць руіны: спярша — гістарычна-значныя (ад усіх 70 сінагог дарэвалюцыйнага Віцебска ацалелі толькі рэшткі адной), а потым — развалiны дамоў ужо паваеннага часу, якім даўно пара дапамагчы ператварыцца ў друз.

— Мы будзем захоўваць кожны будынак, важны для асяроддзя і для гісторыі Віцебска, — запэўніў Леанід Левін. — Ніводзін аб'ект, што ўяўляе з сябе гісторыка-культурную каштоўнасць і ўключаны ў Дзяржаўны спіс, не будзе зруйнаваны. Больш за тое: творчая група выступіць з прапановай унесці ў гэты спіс тыя віцебскія камяніцы, якія туды пакуль не трапілі. А сінагога нарэшце дачакаецца рэстаўрацыі.

Тэхніка сёння здольная тварыць цуды. І таму архітэктары могуць не толькі распавесці пра свае задумы, але і паказаць іх — амаль з фатаграфічнай дакладнасцю. І карцінкі ўражваюць: на месцы нейкага непрэзентабельнага буданчыка стаіць шыкоўны гатэль, вуліца выбрукавана пад даўніну і на ёй поўна кавярняў, сувенірных крамак ды іншых неабходных інфраструктурных аб'ектаў.

Але самая галоўная дэталь віртуальнай мадэлі, якая адразу кінулася ў вочы праз свой кантраст з рэчаіснасцю, — гэта тое, што на Пакроўскай шматлюдна (хай сабе і з дапамогай "Фоташопу"). Бо сёння там стаіць цішыня. Толькі зрэдчас яна парушаецца рокатам матораў турыстычных аўтобусаў. Адзіны па-сапраўднаму прыцягальны аб'ект тут — гэта дом-музей.

**Так архітэктары візуалізавалі свае ідэі.**

— А ўявіце сабе, як "утульна" тут бывае ўзімку вечаровай парой! — падкідвае дроў у агонь Людміла Хмяльніцкая. — Тады здаецца, быццам гэтая частка горада наогул вымірае.

Пасля наведвання музея турысты сядаюць у свае аўтобусы і ад'язджаюць. Хаця, магчыма, многія і затрымаліся б, каб уволю надыхацца атмасферай шагалаўскага Віцебска. Але рабіць на Пакроўцы папросту няма чаго: ні гатэля, ні кавярні тут не знойдзеш. Ды і на тэрыторыі музея сёння не тое што кавы не вып'еш — няма нават дзе "носік прыпудрыць".

Людміла Хмяльніцкая патлумачыла, што стварыць патрэбную інфраструктуру на цяперашніх музейных плошчах немагчыма: яны поўнасцю заняты экспазіцыяй, і нават для сувенірнай лаўкі месца там не знайшлося. Так, яшчэ пару гадоў таму аддзелам культуры Віцебскага гарвыканкама было прапанавана дапасаваць да музейнага комплексу некалькі "навабудаў", якія нібыта сышлі з шагалаўскіх карцін, размясціўшы там і гатэль, і кавярню, і сувенірную лаўку...

— Шагал вельмі часта маляваў Віцебск, — кажа Леанід Левін. — Але цяпер таго Віцебска ўжо бадай не пабачыш. І таму мы паставілі задачу вярнуць музею мастака тое асяроддзе, якое натхняла Шагала, абапіраючыся менавіта на яго творы.

Прэцэдэнты гэтай мастацкай з'явы мне не вядомы. Жывапісныя творы, у якіх адлюстравана архітэктура, — рэч звыклая. А вось калі архітэктура паўстае на аснове жывапісу...

### Школа з крыг лёду

Архітэктары паставілі перад сабой задачу спалучыць неспалучальнае — "правінцыйную" эстэтыку XIX стагоддзя, якую так любіў мастак, і звышсучасныя гмахі, дзе знайшлі б сваё адлюстраванне ідэі авангардыстаў. Трохі ўзбоч ад Пакроўскай запланавана ўзвядзенне будынка, што мае шансы ўвайсці ў гісторыю як самы арыгінальны (але адначасова — і самы спрэчны) узор беларускай архітэктуры свайго часу. Складаная канструкцыя Міжнароднай школы мастацтваў нібы зроблена з вострых крыг лёду. Нават у праекце яна ўражвае!

Але суседства гэтага высокага гмаху з маленькі дамкамі сёння выклікае насцярожанасць у некаторых віцябчан. Ці не створыць ён дысгармонію? І ці будзе рэзкі канстраст паміж старым і новым сапраўды эстэтычным? Зрэшты, архітэктары настойваюць, маўляў, прыкрай эклектыкі ім удасца пазбегнуць.

Але, між тым, паўстанне школы сведчыць: Шагалаўскі цэнтр займее не толькі камерцыйны складнік (які відавочны), але таксама і культурна-асветніцкі. Гэтая ўстанова ставіць перад сабой амбітныя планы вярнуць Віцебску статус аднаго з цэнтраў сучаснага мастацтва. Па словах Леаніда Левіна, навучэнцамі школы маюць станавіцца самыя перспектыўныя маладыя мастакі з усяго свету. Можна спадзявацца і на тое, што карыфеі contemporary art будуць лічыць за гонар даць майстар-клас на радзіме Шагала. На думку архітэктара, менавіта гэтае імя можа натхніць замежных мецэнатаў на фінансаванне праекта: хто ж не захоча ўпісаць побач з ім і ўласнае?

Пра канкрэтны характар увасаблення гэтай задумы казаць сёння яшчэ зарана: пакуль што мецэнатаў не знайшлося. Але пэўны правобраз у Віцебску яна ўжо мае. Міжнародная летняя школа пры музеі Марка Шагала, калі падлеткі вучацца разняволенай творчасці на аснове сінтэзу розных відаў мастацтва, пройдзе сёлета ўжо трэці раз.

### Селядзечная ў "музейным варыянце"

З гэтага і пачнецца стварэнне Шагалаўскага цэнтра. Доміку майстра будзе вернута арганічнае атачэнне: побач паўстануць драўляныя дамкі — па вобразе і падабенстве тых, якія мастак бачыў на ўласныя вочы. На сценах з'явяцца стылізаваныя пад даўніну шыльды: "Карчма", "Гасціны двор"... Зразумела, што эстэтыка будзе спалучацца тут з функцыянальнасцю. Паўстане з нябыту і Ільінская царква, неаднаразова ўвекавечаная на палотнах майстра. Яшчэ адзін важны аб'ект — селядзечная, дзе гандлявала маці Марка. Праўда, яна адродзіцца, хутчэй, ужо ў "музейным" варыянце.

Дзякуючы Шагалу, Віцебск стаў адным з самых прыцягальных гарадоў для замежных турыстаў: многія з тых, хто прамінае Беларусь транзітам, заязджаюць толькі сюды, абмінаючы нават сталіцу. Але пабываўшы на Пакроўскай, разумееш: турбізнес — гэта толькі адзін са складнікаў праекта Цэнтра. Ён будзе разлічаны не толькі на турыстаў, але і на саміх віцябчан.

Сям'я Шагалаў выбрала вельмі зручнае месца жыхарства — прынамсі, з сучаснага пункта гледжання: у трох кроках ад Пакроўскай — абодва віцебскія вакзалы, ды і ад цэнтра адсюль хвілін пятнаццаць пехатой. Зразумела, такія перспектыўныя тэрыторыі ў любым выпадку павінны мець куды лепшае прымяненне, чым маюць цяпер. І стварэнне Цэнтра павінна "забіць адразу двух зайцоў": паспрыяць не толькі ўшанаванню памяці мастака і стварэнню турыстычнай адметнасці, але і пераўвасабленню "брыдкага каченяці" ў фешэнебельны раён горада. Літаральна за спінай у бронзавага Шагала праектуецца ўваход у вялізны гандлёва-забаўляльны цэнтр, аналагаў якому ў Віцебску пакуль што няма, а на Рэспубліканскай, а потым і на іншых вуліцах, спрэс да Кірава, размесціцца кварталы элітнага жылля.

Дарэчы, ад жылога сектара гэты раён не будзе пазбаўляцца. Як справядліва адзначыла Людміла Хмяльніцкая, у адваротным выпадку ён стаў бы безжыццёвым. Праўда, ці ўдасца захаваць у прэстыжным раёне той непадробны каларыт унутраных дворыкаў, дзе і сёння, як і сто гадоў таму, на вяроўках сушыцца бялізна? Але што рабіць — без ахвяр не абыходзіцца...

* * *

Сродкі для ўвасаблення задум у жыццё віцебскія ўлады спадзяюцца знайсці перадусім праз прыцягненне замежных інвестыцый. Вядома, час цяпер для глабальных бізнес-ініцыятыў не надта спрыяльны. Але... стаўленне да праекта ў Віцебску аптымістычнае.

— Уклаўшы аднойчы сродкі ў Шагалаўскі цэнтр, інвестар можа разлічваць на пастаянныя дывідэнды, — кажа Людміла Хмяльніцкая. — Попыт на тую або іншую прадукцыю залежыць ад зменлівай кан'юнктуры рынка, а вось значнасць імя Шагала ніколі не зменшыцца.

Без сумневу, адзін асобна ўзяты інвестар не здолее цалкам "пацягнуць" маштабны праект. Таму ўсім патэнцыйна зацікаўленым прапануецца ўзяць на сябе адну канкрэтную яго частку — згодна з уласнымі магчымасцямі. Хтосьці захоча ахвяраваць на стварэнне Іудзейскага рэлігійнага цэнтра ў адрэстаўраванай сінагозе, хтосьці ўкладзе грошы ў звышсучасны гатэль, які запланаваны насупраць, а хтосьці — у сувенірныя крамы. Паасобку такія інвестыцыі былі б не надта прывабнымі: хто захоча будаваць фешэнебельны гатэль насупраць руін?

Першы крок у ажыццяўленні праекта ўжо зроблены. Паводле Генеральнага плана Віцебска, зусім побач з Шагалаўскім дамком меўся праходзіць вялізны пуцеправод праз Дзвіну. Зразумела, у гістарычным месцы такая магістраль зусім недарэчы. І хаця праектныя работы па яе стварэнні ўжо завяршаліся, Аляксандр Косінец пагадзіўся з прапановай Леаніда Левіна перанесці пуцеправод у іншае месца.

Зрэшты, не толькі гэта сведчыць пра сур'ёзнасць намераў абласных улад. Куды больш красамоўнае сведчанне — тыя пераўвасабленні, што паўсюдна дзеюцца ў гістарычным цэнтры Віцебска, дамінантамі якога з нядаўняга часу сталі дзве адроджаныя барочныя царквы. Гасцей сёлетняга "Славянскага базару" чакае нямала прыемных здзіўленняў...

Барочныя вежы Успенскай царквы — прывабны фон для новых інвестыцый у турінфраструктуру Віцебска. У тым ліку, і чыста з прагматычнага пункта гледжання.

**Ілля СВІРЫН**

# Сам сабе рэжысёр. А прафесіянал?

## Пляцоўка для будучых геніяў

На Беларусі ахвотных стаць кінарэжысёрамі не менш, чым у якой іншай развітай краіне свету. Дастаткова паглядзець у праграму III Адкрытага студэнцкага фестывалю кіно і відэа "Кінаграні-2009", заснавальнікамі якога з'яўляюцца Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт і Беларускі дзяржаўны універсітэт. Яго пляцоўкамі сталіся мінскія кінатэатры "Цэнтральны" і "Цэнтр-відэа". Адметна, што нарадзілася "Кінаграні" як агляд фільмаў аматараў і пачаткоўцаў. Яна стала пераемнікам невялікага фестывалю кінашкол і аматарскіх гурткоў, які некалькі разоў праводзіўся ў Мінску Беларускім саюзам кінематаграфістаў. З часам ідэя засталася той жа, маштабы — змяніліся: з гэтага года "Кінаграні" стала міжнароднай, яе паказы праводзіліся ў двух конкурсах.

Беларускія ўдзельнікі-пачаткоўцы, у асноўным, былі аб'яднаны ў конкурснай праграме незалежнага і аматарскага кіно. Стужкі студэнтаў кінашкол з-за мяжы і лепшыя айчынныя работы апынуліся ў праграме "Маладыя прафесіяналы". Абмяркоўвалі фільмы таксама прафесіяналы, толькі ўжо са стажам: журы ўзначальвалі дзеючыя рэжысёры дакументальнага кіно Міхаіл Ждановскі і Аляксандр Карпаў, у склад увахадзілі вядомыя беларускія рэжысёры, кіназнаўцы, а таксама расійскі крытык Сяргей Кудраўцаў.

Адборачная камісія літаральна танула ў дысках з мастацкімі, дакументальнымі, анімацыйнымі, эксперыментальнымі стужкамі і музычным відэа, дасланымі на конкурс. Бандэролі з фільмамі прыйшлі ў Мінск з усіх кантынентаў, за выключэннем Аўстраліі. Не менш шырокай аказалася і жанравая разнастайнасць. Уражвалі дэманстрацыйныя дыскі еўрапейскіх кінашкол з дзесяткамі мастацкіх і дакументальных кароткаметражных стужак. Але, разам з тым, было прыемна адчуць: некаторыя стужкі беларускіх аўтараў, хай сабе і знятыя на значна меншыя бюджэты і не на сапраўдную кінаплёнку, а на лічбавую камеру, па ўзроўні сваёй задумы выглядаюць не горш за вучэбныя працы прэстыжных замежных брэндаў накшталт ВГИКа. І няхай Гран-пры атрымаў фільм "Агапэ" Слабадана Максімавіча са Славеніі, сярод пераможцаў конкурсу "Маладыя прафесіяналы" аказаліся і беларусы. Музычнае відэа "Тры анёлы" Юліі Рудзіцкай прызнана найлепшым у сваёй катэгорыі. Ды і агульны ўзровень міжнароднага конкурсу быў надзвычай высокі, пакідаючы выдатнае ўражанне ад фестывалю.

Думаецца, павучыцца ў маладых энтузіястаў, якія займаліся арганізацыйнай працай, могуць калегі і з больш "дарослых" кінафорумаў. Фестываль доўжыўся пяць дзён і абышоўся без пышных цырымоній. Ды на "Кінаграні" галоўнае (што абавязкова павінна прысутнічаць на любым фестывалі) — спрыяльная атмасфера для зносін удзельнікаў. Дарэчы, госці і журналісты адзначылі таксама вельмі цікавую публіку ў залах, якую, мусіць, збірае не кожнае кінамерапрыемства ў сталіцы.

## Як стаць прафесіяналам?

Трэцяя "Кінаграні" стала добрай стартавай пляцоўкай менавіта для тых, хто жадае потым працаваць у кінаіндустрыі. З гэтым згодзен і адзін з членаў журы, рэжысёр Аляксандр Карпаў. Дарэчы, мастацкі кіраўнік РУП "Беларускі відэацэнтр" якраз і займаецца тым, што дапамагае кінаматарам атрымаць больш высокі прафесійны статус. На факультэце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў ён вядзе рэжысёрскі курс. За два гады руплівай працы слухачы маюць магчымасць атрымаць веды, неабходныя для далейшай кар'еры на тэлебачанні або кінастудыі.

— Цяпер існуе меркаванне: маўляў, калі чалавек узяў у рукі камеру, зняў, напрыклад, вяселле, потым зманціраваў, "падклаў" музыку, то гэта ўжо кіно, — гаворыць Аляксандр Аляксандравіч. — Я ў такіх выпадках заўсёды нагадваю: алфавітам карыстаюцца абсалютна ўсе людзі, але толькі ў Льва Талстога літары склаліся ў "Вайну і мір". Так і ў кіно: прафесіянал — гэта той, хто з дапамогай выявы не проста перадае інфармацыю, а стварае мастацтва.

Каб стаць прафесіяналамі ў галіне кіна- і тэлерэжысуры, на курсе Аляксандра Карпава займаецца 16 чалавек. Некаторыя з іх, як адзін з арганізатараў "Кінаграні" — Андрэй Куціла, напрыклад, ужо атрымалі за сваю творчасць прызы і паўдзельнічалі ў прэстыжных фестывалях.

— Я лічу, што двухгадовая форма адукацыі для рэжысёраў — самая аптымальная на сённяшні момант, — працягвае Аляксандр Карпаў. — Каб здымаць кіно, спрабаваць сказаць у ім нешта сваё, трэба мець дастатковы жыццёвы вопыт. Што можа сказаць свету шаснаццацігадовы выпускнік школы? На працягу пяці гадоў класічнай формы навучання ён будзе гэты вопыт толькі атрымліваць. Нездарма так шмат вядомых дзеячаў савецкага і расійскага кіно выйшла з двухгадовых Вышэйшых курсаў. На нашы ж заняткі прыходзяць дарослыя людзі, якім ёсць што сказаць, але ім трэба навучыцца спецыфічнай кінамове. І такая самая двухгадовая сістэма існуе ў Нью-Йорку, Варшаве і шмат дзе яшчэ.

Майстар мае рацыю. Па прыклады далёка хадзіць не трэба: многія беларускія майстры вялікага экрана спачатку атрымалі нейкую іншую адукацыю. Славуты аўтар "Белых Рос" Ігар Дабралюбаў, напрыклад, скончыў факультэт журналістыкі. Сённяшні ж лідэр айчыннай дакументалістыкі Віктар Аслюк не проста мае дыплом педагога: перад тым, як прыйсці ў Акадэмію мастацтваў, ён адпрацаваў у звычайнай сярэдняй школе сем гадоў.

Сапраўды, кінарэжысура — такое складанае поле дзейнасці, дзе не абысціся механічнымі навыкамі. Вядома выказванне аднаго французскага рэжысёра: "Я прадумаў будучы фільм цалкам у галаве. Засталося толькі яго зняць". Знешні бок кінапрацэсу — тэхніка, абставіны здымак — самы лёгкі. Гэтую думку пацвярджае і Аляксандр Карпаў:

— Навучанне рэжысёрскай прафесіі не толькі ў тым, каб правільна ставіць камеру ці манціраваць стужку. Галоўная задача — ператварыць жыццё ў філасофію кіно. Дзеля гэтага мы і даём нашым навучэнцам веды па драматургіі, гісторыі кіно, мастацтва ў цэлым. Я вельмі задаволены сваімі апошнімі вучнямі. Гэта вельмі таленавітыя хлопцы і дзяўчаты. Але ў кінаманладзі мне не падабаецца пэўная яе неадукаванасць. Бывае, глядзіш фільм пачаткоўца і разумееш: яго рэжысёр упэўнены — кіно да яго не існавала. У кожным другім фільме — "вынаходніцтва веласіпеда". Я ім кажу: "Вазьміце паглядзіце карціны, якія здымалі хаця б дваццаць гадоў таму!" Але менавіта гэта і прывабліве ў аматарскіх стужках: шчырасць, чысты погляд на рэчаіснасць. Таму я з радасцю адгукнуўся на запрашэнне ўзначаліць конкурс аматараў на "Кінаграні". Бывае, у стужках пачаткоўцаў сустрэнеш такі ракурс на звычайныя рэчы, якога няма ў работах славутых майстроў. З іншага боку, студэнты могуць спрацаваць па калісьці ўбачаным шаблоне, і ніякай цікавасці такія дэбюты не выклікаюць.

## Як зрабіць з аматара-пачаткоўца кінематаграфіста

**Першымі кінарэжысёрамі, зразумела, былі непрафесіяналы: фатографы, артысты, нават людзі іншых, несумежных, прафесій. Але з часам, каб трапіць у цудоўны свет кіно, стала патрабавацца прайсці адпаведны адбор, скончыць вышэйшую навучальную ўстанову, атрымаць дазвол называцца прафесіяналам ад старшых калег.**

**Сёння ж мы нібыта вярнуліся... у часы братоў Люмьераў: вынаходніцтва танных лічбавых відэакамер, імклівае развіццё кампьютэрнай тэхнікі дазваляюць ствараць сваё кіно ці не кожнаму ахвотнаму. "Сам сабе рэжысёр" — гэтае вызначэнне стала агульнаўжывальным. А з развіццём Інтэрнета кожны можа стаць яшчэ і пракатчыкам-дыстрыб'ютарам: самі здымаем, самі паказваем адзін аднаму.**

**Але як жа быць з мастацкім узроўнем самаробных твораў? Ці не знікне мяжа прафесійнага і аматарскага кіно? Наогул, як "адрэагуе" на новую культурную сітуацыю "найвялікшае з мастацтваў"? Пытанняў пакуль значна больш, чым адказаў. Зразумела адно: шматлікія маладыя таленты атрымалі рэальны шанц "прагучаць" са сваімі аматарскімі работамі і — хто ведае? — стаць сапраўднымі рэжысёрамі і аператарамі, быць запатрабаванымі грамадствам. Толькі перш чым назваць сябе прафесіяналамі і атрымаць першыя замовы і ганарары, давядзецца шмат што зрабіць і шмат чаму навучыцца. Дарэчы, уменне здымаць можа быць тут не самым галоўным...**

## З аматараў глядзець у...

У праграме "Кінаграні" аб сабе заявілі 129 кароткаметражных стужак, зробленых цягам мінулага і на пачатку гэтага года, з якіх амаль палова — беларускія. Калі ўлічваць, што галоўнай умовай адбору фільмаў на форум быў узрост аўтараў (да 31 года) і дэбютны характар работ, відавочнай становіцца колькасць патэнцыйных Феліні і Спілбергаў, што жывуць у нашай краіне. Як бачым, маем адукацыйныя ўстановы, дзе яны могуць атрымаць належную адукацыю.

Але, для таго, каб усе бакі іх таленту раскрыліся, а самі яны атрымалі надзейнае месца працы, наша кінамастацтва не павінна спыняцца ў сваім развіцці. У гэтым упэўнены і Аляксандр Карпаў, які хвалюецца за працаўладкаванне сваіх выпускнікоў. Арганізацый, што здымаюць кіно, на Беларусі не так і шмат. Застаецца тэлебачанне, але, яно, як вядома, не заўсёды дае прастору для аўтарскай кінадумкі. Дарэчы, большасць замежных удзельнікаў "Кінаграні" таксама знойдуць сябе не ў вялікім кіно, а ў тэлебачанні, музычным ды кампʼютэрным відэа.

## Было б жаданне!

Сярод удзельнікаў конкурсу "Маладыя прафесіяналы" сваім мастацкім узроўнем вылучаўся фільм "Шлях у рай зачынены" Сяргея Каласоўскага. Прозвішча гэтага маладога аўтара можна сустрэць у цітрах да апошніх карцін студыі "Летапіс" у якасці мантажора. Нічога дзіўнага не было б, каб не ведаць, што ніякай спецыяльнай адукацыі ў мінчаніна няма. Інжынер Сяргей Каласоўскі заўсёды цікавіўся кінематографам. Чатыры гады таму ён прыйшоў у Музей гісторыі беларускага кіно з прапановай зладзіць клуб для аматараў кінамастацтва. Фарміраванне гэтае ў музеі ўжо было, і Сяргей прымаў актыўны ўдзел у яго пасяджэннях. Спачатку абмяркоўваў прагледжаныя шэдэўры, а пасля сам узяў у рукі камеру. Потым самастойна асвоіў мантаж і, як вынік, цяпер — у штаце "Беларусьфільма".

"Шлях у рай зачынены" — прафесійна зробленая праца з прафесійнымі акцёрамі і агучваннем. Мяркуем, гэта не апошні фільм Каласоўскага. Як ён сам — не апошні чалавек, які прыйдзе працаваць у нацыянальны кінематограф пасля зацікаўленых праглядаў стужак у кінаклубах. Апошніх, дарэчы, у Мінску з кожным годам становіцца ўсё больш.

**Антон СІДАРЭНКА**

**"Стрыжнёвы" фактар і някніжная статыстыка**

# Факсіміле духоўнасці на інфармацыйным полі

**24 мая ў славянскіх краінах адзначаецца Дзень славянскага пісьменства і культуры ў гонар святых Кірылы і Мяфодзія. З 21 па 29 мая з гэтай нагоды ладзяцца штогадовыя, ужо пятнаццатыя па ліку, Міжнародныя чытанні, што носяць імя балгарскіх першаасветнікаў.**

**Па традыцыі, выдавецтва Беларускага экзархата стане актыўным удзельнікам гэтага буйнога форуму, дзе прадставіць свае навінкі і найбольш папулярныя выданні. Між іншым, летась гэтай структуры Беларускага экзархата споўнілася 10 гадоў.**

**У кантэксце духоўнай асветы і меркаваў павесці гутарку з выканаўчым дырэктарам выдавецтва Беларускага экзархата Уладзімірам ГРОЗАВЫМ. Ды пачалі мы з тэмы, падавалася б, зусім процілеглай...**

## Прычынай — караблі

**— Уладзімір Усеваладавіч, перш чым гаварыць аб выдавецкіх справах, скажыце колькі слоў пра сябе. Усё ж выдавецтва Беларускага экзархата — асаблівае, і чалавеку, які ўзначальвае яго, на маю думку, мала быць высокаадукаваным, глыбока эрудыраваным...**

— Мы з выдавецтвам, так бы мовіць, равеснікі. У тым сэнсе, што я працую ў ім з самага пачатку — з 1998-га года. Але перш чым стаць выдаўцом, мне давялося авалодаць іншай важнай прафесіяй, прытым даволі рэдкай.

**— Што ж гэта за прафесія такая?**

— Разведчыка!

**— І раптам працуеце ў такой сферы!**

— Як кажуць, "пути Господни неисповедимы". А пра астатняе магу расказаць шчыра, як на споведзі.

Маленства маё прайшло ў вёсцы Камяно на Лагойшчыне ў сям'і лесніка. У чатырнаццацігадовым узросце мяне як выдатніка вучобы накіравалі ва Усесаюзны піянерскі лагер "Артэк". Асабліва ўразілі мяне караблі, што стаялі ў Севастопалі на ваенна-марской базе. Адразу захацелася стаць ваенным мараком. Таму, калі скончыў сярэднюю школу, падаў дакументы ў Ленінградскае вышэйшае марское вучылішча. На жаль, не ўдалося прайсці строгую медыцынскую камісію: у мяне выявілі даўні пералом рукі. Але без арміі я ўжо не ўяўляў свайго жыцця. Вырашыў паступаць у БДУ, даведаўшыся, што на геаграфічным факультэце ёсць ваенная кафедра.

**— А чаму менавіта на геафак?**

— Захацелася стаць разведчыкам. Таму разважаў так: геаграфія і разведка — у чымсьці паняцці блізкія. І першае, і другое звязана з рамантыкай. Не сумняваўся і ў тым, што, калі пасля атрымання вышэйшай адукацыі падам рапарт аб жаданні служыць у арміі, медыцынская камісія будзе менш строгай, чым у ваенным вучылішчы. Камісію я сапраўды прайшоў, падаў рапарт аб накіраванні ў Афганістан. Аднак, як кажуць, трапіў туды, куды трапіў.

## Бласлаўленне на выдавецтва

**— Магу пагадзіцца з вамі, што прафесіі географа і разведчыка ў чымсьці блізкія. Але быць разведчыкам — і стаць кнігавыдаўцом, прычым такой спецыфічнай літаратуры?..**

— Прычынай усяму — перабудова. Многія тады па-новаму зірнулі на свой радавод. Аказалася, што і ў нашым родзе былі манахі.

Прафесію сваю я на той час вельмі любіў і развітвацца з ёю не думаў. А вось мая стрыечная сястра, скончыўшы педагагічнае вучылішча, нечакана паведаміла сваім бацькам, што хоча ісці ў манастыр. Угаворы нічога не далі, і яна стала манахіняй. Дарэчы, я сам яе і адвёз у адзін з манастыроў. А праз некаторы час сям'я наша ехала адпачываць у санаторый. Вырашылі заехаць на хвілін пятнаццаць у Задонскі манастыр, каб перадаць аднаму адрасату пісьмо. Ехалі на хвілін пятнаццаць, а затрымаліся на два тыдні.

**— І што вас там затрымала?**

— Мне сказалі: прыйдзе старац і будзе рабіць адчытку. Хто такі старац, што такое адчытка, — я, зразумела, тады не ведаў, але паколькі той, каму нас прасілі перадаць ліст, адсутнічаў, то мы і вырашылі папрысутнічаць пры адчытцы. Тое, што адбывалася пад час яе, мяне настолькі ўразіла, што стаў быццам сам не свой. Можаце ўявіць сабе: разведчык, вышэйшы афіцэр два тыдні працаваў у манастыры! Прычым добраахвотна, ніхто мяне да гэтага не прымушаў.

**— А далей?**

— Далей быў распад Савецкага Саюза і маё, калі можна так сказаць, духоўнае ўзвышэнне і душэўнае ачышчэнне. Служба ў арміі для мяне страціла ўсялякі сэнс. Трэба было авалодваць нейкай новай прафесіяй. І тут я ўпершыню зразумеў: два тыдні, праведзеныя ў Задонскім манастыры, не прайшлі марна. Захацелася прысвяціць сябе службе Госпаду. Я стаў эканомам Спаса-Узнясенскага храма ў Фаніпалі. Дакладней, самога храма яшчэ не было. Мы пачалі яго ўзвядзенне з нуля. Збіралі ахвяраванні, у тым ліку і будаўнічымі матэрыяламі, шукалі рабочых. Але, нарэшце, храм быў здадзены і асвечаны.

Потым мне давялося пабываць у Пскоўска-Пячэрскім манастыры, дзе пазнаёміўся са старцам, духоўнікам, архімандрытам Янам Крэсцьянкіным, на жаль, сёння ўжо нябожчыкам. Унікальны быў чалавек, цяжкага лёсу: пятнаццаць гадоў правёў у сталінскіх лагерах. Ён і сказаў, што мне трэба працаваць у выдавецтве, чаму я вельмі здзівіўся. А ў адказ пачуў: "Ты не смейся, выдавецкая справа вельмі важная. Лічы, што яна — апостальская праца". Бласлаўляючы мяне на гэтую працу, вынес іконкі анёла-ахоўніка: "Кожнаму з тваіх дзетак". Я паглядзеў: пяць іконак, а дзяцей у мяне толькі двое. "Бацюшка, — кажу, — тры іконкі — лішнія", а ён у адказ: "У Бога нічога лішняга няма". Праз некалькі месяцаў мы з жонкай павянчаліся, і сапраўды: Усявышні даў нам яшчэ трох дзетак.



## Праекты адзінкавыя і серыйныя

— Выдавецтва Беларускага экзархата не было б, каб прыкладна пятнаццаць гадоў таму ў Мінску, па вуліцы Прытыцкага, не распачалося будаўніцтва храма у гонар іконы "Усіх тужлівых Радасць". Тады на гэтым месцы з'явілася звычайная армейская палатка, якую я ўстанаўліваў сваім рукамі. З часам выдавецтва пераехала ў адзін з будынкаў, што знаходзіцца на тэрыторыі храма.

**— Калі ласка, пазнаёмце хаця б з некаторымі выданнямі.**

— Да святкавання 1020-годдзя Хрышчэння Русі выдалі чатырохтомнік песняспеваў, над якім працавалі больш за пяць гадоў. Такі праект ажыццёўлены ўпершыню ў практыцы праваслаўнага кнігавыдання. Выходзяць і асобныя зборнікі акафістаў. А вось яшчэ адна унікальная кніга — "Хрышчэнне Русі", напісаная вядомым рускім гісторыкам Канстанцінам Бястужавым-Руміным. Апошнім разам яна выдавалася яшчэ ў 1865 годзе ў Санкт-Пецярбургу. Мы на падставе таго выдання зрабілі новае, у сучаснай арфаграфіі, багата праілюстраваўшы яго. Дарэчы, мастацкаму афармленню пастаянна надаём вялікую ўвагу, клапоцячыся аб тым, каб кніга адначасова станавілася і творам мастацтва.

Працуем і над серыйнымі выданнямі. У іх шэрагу — і адрасаваная дзецям бібліятэчка, якая расказвае аб праваслаўных святых. Яшчэ адна серыя называецца "Слава Айчыны": яна прысвечана гераічным падзеям слаўнага мінулага братніх славянскіх народаў. "Першынцам" у ёй стала кніга Аляксандра Вялько "Бітва ля Лясной" — пра тую самую бітву, што адбылася на Беларусі са шведамі, якую Пётр I назваў "маці Палтаўскай баталіі". Не магу не сказаць і пра тое, што вялікую ўвагу мы надаём выпуску рэлігійнай і філасофскай спадчыны. Ды хіба ўсе кнігі назавеш! Толькі сёлета пабачаць свет амаль 150 найменняў.

**— А якія бліжэйшыя планы ў выдавецкай дзейнасці?**

— Завяршаецца унікальны выдавецкі праект, які ажыццяўляем сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, — выпуск факсімільнага выдання знакамітага Слуцкага Евангелля. На сённяшні дзень у свеце захоўваецца толькі адзін асобнік гэтага унікальнага помніка, які адносіцца да XVI стагоддзя. Ён быў перададзены вернікамі Высокапраасвяшчэннейшаму Мітрапаліту Мінскаму і Слуцкаму, Патрыяршаму Экзарху ўсяе Беларусі Філарэту. Зразумела, што падобных праектаў — адзінкі, тым больш, яны робяць гонар нашаму выдавецтву.

Самая ж вялікая праблема і адначасова самая вялікая наша задача — "даць" вобраз сучаснага станоўчага героя. Сёння, як вядома, інфармацыйнае поле запаўняюць розныя "супермены", прапагандуецца насілле, а тыя, хто з'яўляюцца сапраўднымі сынамі сваёй зямлі, хто годна працягвае справу сваіх бацькоў, бывае, абыдзены ўвагай. Спадзяюся, што такія героі таксама прыйдуць на старонкі нашых кніг.

## У цэнтры — сям'я

**— Наколькі вядома, структура ваша не абмяжоўваецца толькі выдавецкай дзейнасцю.**

— На сёння выдавецтва Беларускага экзархата — буйны асветніцкі цэнтр Праваслаўнай Царквы ў Рэспубліцы Беларусь. Ужо шмат гадоў мы з'яўляемся адным з арганізатараў і экспанентаў духоўна-асветных выставак-кірмашоў "Беларусь праваслаўная". Добрай традыцыяй стала супрацоўніцтва з Рэспубліканскім фестывалем сучаснай хрысціянскай культуры "Дабравест". Апроч таго, наша выдавецтва — пастаянны арганізатар і ўдзельнік Міжнародных адукацыйных Свята-Панцеляймонаўскіх чытанняў. Канкрэтным укладам у развіццё супрацоўніцтва паміж дзяржавай і Царквой стала праграма "Сям'я — лучнасцю і любоўю выратуемся", арганізаваная ў ліпені 2007 года ў Слуцку сумесна з адміністрацыяй Мінскага аблвыканкама і Слуцкага райвыканкама. Сёлета яна ладзілася ў Жодзіне, потым — у Старых Дарогах, а таксама адбудзецца ў Салігорску.

**— Думаецца, правядзенне менавіта такой канферэнцыі стала невыпадковым...**

— Моцная, здаровая, жыццядайная сям'я неабходна менавіта цяпер, калі асаблівая ўвага грамадства скіравана на дэмаграфічную сітуацыю. Дарэчы, у супрацоўнікаў нашага выдавецтва, калі браць у сярэднім, атрымліваецца больш як па тры дзіцяці на сям'ю. Важны, думаецца, і такі момант: трэба ў выхаванне вярнуць мужчынскі пачатак — і ў сям'і, і ў школе.

**— У сувязі з гэтым на сённяшнім этапе набывае важнае значэнне ўдасканаленне ўзаемаадносін Царквы і дзяржавы.**

— Як вядома, паміж нашай дзяржавай і Праваслаўнай Царквой падпісана магістральнае пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі, культуры, інфармацыі. У ім ёсць пункты, што абавязваюць выкарыстоўваць духоўныя скарбы для выхавання і навучання. Таму ў нас цеснае супрацоўніцтва з бібліятэкамі — як школьнымі, так і публічнымі, а таксама з рознымі ўстановамі і ведамствамі. Дарэчы, я з'яўляюся старшынёй Рэспубліканскага дзяржаўнага аб'яднання бацькоў і настаўнікаў за адраджэнне праваслаўнай адукацыі. Чалавек, які выхоўваецца на праваслаўнай традыцыі, што ўвабрала ў сябе духоўныя каштоўнасці продкаў, валодае сумленнем, а гэта той "стрыжнёвы" фактар у яго душы, што дазваляе яму з адказнасцю ставіцца і да вучобы, і да жыцця ў цэлым, і да блізкіх. Калі ўзнікаюць цяжкасці, нейкія тупіковыя моманты, ён разумее: цяжкасці даюцца нам самім Богам. Спадзяюся, у вяртанні да Бога тых, хто прагне духоўнага ачышчэння, і дапамагаюць кнігі выдавецтва Беларускага экзархата.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# Эканоміка на Чытаннях

**21 мая ў Інстытуце тэалогіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта адкрыліся XV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні. Арганізавана мерапрыемства БДУ сумесна з Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў.**

Як паведаміла прарэктар па навуковай рабоце БДУКіМ Марыя Мажэйка, Чытанні прысвечаны Міжнароднаму дню славянскага пісьменства і культуры. У праграме форуму, акрамя прадстаўнікоў з Беларусі, удзельнічаюць навукоўцы з блізкага і далёкага замежжа: Расіі, Украіны, Літвы, Кітая, Камеруна.

Тэма Чытанняў — "Духоўныя асновы сацыяльнай і эканамічнай устойлівасці сучаснага грамадства". Адно з галоўных пытанняў, якое закраналася на форуме, — абмеркаванне праблем, звязаных з сусветным фінансавым крызісам. Як зазначылі арганізатары мерапрыемства, мэта форуму — наладжванне камунікацыі паміж спецыялістамі ў сферы эканамічных навук, прадпрымальнікамі, тэолагамі і філосафамі з розных краін, і як вынік — згладжванне антаганізмаў і збліжэнне ва ўмовах эканамічнай дэстабілізацыі. Важнай рысай мерапрыемства з'яўляецца імкненне выкарыстаць вопыт каталіцкай і пратэстанцкай цэркваў Еўропы і Германіі, у прыватнасці, у справе рэалізацыі сацыяльных дактрын.

У межах Чытанняў 22 і 23 мая запланавана праца дзвюх секцый: "Эканоміка і духоўнасць: гісторыя і сучаснасць" і "Рэлігійна-філасофскія, рэлігіязнаўчыя і культуралагічныя даследаванні". З навуковымі дакладамі на секцыях выступяць прадстаўнікі Беларускай Праваслаўнай Царквы, выкладчыкі і студэнты БДУ, БДУКіМ, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта і іншых ВНУ краіны, Нацыянальнага інстытута адукацыі.

На базе БДУКіМ учора адбыўся Міжнародны сімпозіум "Духоўныя асновы сацыякультурнай устойлівасці сучаснага грамадства", а затым — Навуковы сімпозіум, дзе з прывітальнымі словамі выступілі Высокапраасвяшчэннейшы Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт, міністр культуры нашай рэспублікі Уладзімір Матвейчук, рэктар БДУКіМ Барыс Святлоў. А сёння, 23 мая, у 12.30 за "круглым сталом" удзельнікі Чытанняў абмяркуюць тэму "Духоўныя аспекты антыкрызіснай дзейнасці дзяржавы, бізнес-супольнасці і Царквы".

Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні завершацца 24 мая.

**Ул. інф.**

# "Слова..." да свята

**24 мая ў вячэрнім эфіры тэлеканала "ЛАД" выйдзе спецыяльны выпуск культурна-асветніцкай праграмы "Слова пісьменніка", прысвечаны Дню славянскага пісьменства і культуры.**

Аўтары праграмы "Слова пісьменніка" запрашаюць на сустрэчу з вядомымі беларускімі філолагамі, пісьменнікамі і журналістамі, каб абмеркаваць шляхі развіцця роднай мовы.

Ці не замінае яе самамабытнасці шырокае ўжыванне замежнай лексікі? Пра гэта, сведчаць стваральнікі праграмы, распавядуць рэдактары вядучых беларускіх літаратурна-мастацкіх часопісаў, прадстаўнікі профільных выдавецтваў.

**Паводле паведамлення прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі**

# “Рамантыка...” і энергія жыццеадчування

П.Асоўскі. “Дабравест”.

**У сваёй прадмове да выстаўкі, якая адкрылася 15 мая ў Нацыянальным мастацкім музеі, выдатны расійскі жывапісец Пётр Асоўскі напісаў так: “Гулкія і моцныя ўдары звона Хатыні нагадваюць краіне і свету аб страшэнных гадах страт і непазбежнага гора, якія напаткалі народ Беларусі і пакінулі глыбокі след у яго сэрцах. Журботны гул набатнага звона напамінае не толькі пра бяздонныя бядоты — ён з маркотнай упэўненасцю ўмацоўвае светлыя, мірныя часы, якія наступілі на зялёных прасторных нівах славянскай зямлі Беларусі, што 65 гадоў таму вызвалілася ад фашысцкага нашэсця...”**

**У час адкрыця выстаўкі было агучана віншаванне Прэзідэнта нашай краіны Аляксандра Лукашэнкі на адрас Пятра Паўлавіча, у якім было, у прыватнасці, адзначана: “Няхай гэтая экспазіцыя Вашых твораў у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь дапаможа нашым гледачам глыбей пазнаёміцца з работамі аднаго з самых вядомых майстроў сучаснага выяўленчага мастацтва, паслужыць умацаванню славянскага адзінства, дружбы і супрацоўніцтва брацкіх народаў”.**

Гэта быў час “буры і націску” новага мастацкага напрамку, якое потым увайшло ў гісторыю савецкага мастацтва як “суровы стыль”. Карціна тая ўразіла мяне тым, што мастак паказаў цяжкія будні вясковага жыцця адной сям’і з такой надзвычай праніклівай назіральнасцю, — звыклая тады ў жывапісе тэзісна-тэматычная, плакатная ілюстратыўнасць была адсунута на другі план.

П.Асоўскі. “Дарога да храма”.

Сярод тых, хто выступіў на ўрачыстай цырымоніі ў Нацыянальным мастацкім музеі, — міністр культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Матвейчук, Герой Беларусі, народны мастак СССР і Беларусі Міхаіл Савіцкі, дырэктар установы Уладзімір Пракапцоў, прадстаўнікі Пасольства Расійскай Федэрацыі ў нашай краіне.

Пётр Асоўскі ў сваім слове выказаў сардэчную падзяку за цёплы прыём, які быў аказаны яму і яго выстаўцы мінчанамі і арганізатарамі цудоўнай экспазіцыі.

“Рамантыка славянскіх земляў” прысвечана вялікаму святу, якое мы адзначым 3 ліпеня. І ў гэтым галоўны сэнс мастацкай акцыі рускага жывапісца, для якога наша краіна заўсёды была блізкай і дарагой сэрцу. І як яшчэ адно таму пацвярджэнне — падарунак мастака нашаму музею: Асоўскі перадаў карціну “Дабравест”, створаную акурат сёлета.

...Першай работай Пятра Асоўскага, якую я, тады яшчэ малады чалавек, убачыў у Маскве на пачатку 1960-х, стала карціна “Тры пакаленні”.

Хто тады, у часы хрушчоўскай “адлігі”, мог падумаць, што падобныя творы, як і палотны П.Ніканава, Г.Коржава, А. і П. Смоліных, М.Андронава, Т.Салахава, І.Зарыня, Э.Ілтнера, В.Іванова, В.Папкова, нашых М.Савіцкага, Л.Шчамялёва, М.Данцыга, В.Грамыкі, пакладуць пачатак новаму этапу ў савецкім выяўленчым мастацтве, “где жар живой, правдивой речи, а не вранья холодный дым” (А.Твардоўскі).

З таго часу мінула шмат гадоў. Былы “сурыкавец”-шасцідзесятнік Пётр Асоўскі стаў народным мастаком СССР, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР, правадзейным членам Расійскай акадэміі мастацтваў, кавалерам Залатой медалі італьянскай Акадэміі мастацтваў, і г. д. І — галоўнае — песняром славянскага свету: ад “духоўнай радзімы” — Пскоўшчыны і “малой Радзімы” — Украіны да “краіны высокіх сініх гор і зялёных далін” — Славакіі, земляў “рамантычных замкаў і сярэднявечных гарадоў” — Чэхіі і Польшчы, “светлых фарбаў дня, змроку фантастычных вечароў і глыбокай чысціні паўднёвага неба” — Балгарыі. І — мемарыяльны пейзаж “Курган Перамогі”: гэта ўжо наша Беларусь...

Добра сказаў пра свайго таварыша выдатны мастак Гелій Коржаў: “Пятра Асоўскага хвалююць пачуцці і думкі сённяшняга дня, ён знайшоў для іх форму і мову. Усё глыбей развіваюцца крыніцы, што былі закладзены ў маладосці. Калі я гляджу на яго творы, то адчуваю энергію мастака, які здолеў захаваць юнацкі запал і смеласць, умацаваўшы іх вопытам і ведамі...”

А напрыканцы размовы пра сутнасць выстаўкі П.Асоўскага скажу наступнае. Так, экспазіцыя ўражвае. Уражвае сваёй валявой энергіяй жыццеадчування, праяўленнем настойлівага праўдашукання, нецярпімага да любой хлусні і несправядлівасці. Мастак у сваіх палотнах, прысвечаных паэтыцы славянскіх земляў, дасягнуў асаблівай сканцэнтраванасці свайго жывапісу, паглыблення ў простае і відавочнае, што на паверку аказваецца найскладаным, непазнаным і валодае велізарнай разнастайнай выразнасцю.

Жывапіс Пятра Асоўскага — гэта не толькі “выява”, “вобразатвор”, але і самапазнанне, якое звязана з пошукамі новых духоўна-мастацкіх гарызонтаў...

**Барыс КРЭПАК**

**Каля 40 жывапісных палотнаў прадставіў лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва Васіль Касцючэнка на сваёй персанальнай выстаўцы “Цяпло колеру” ў Нацыянальным мастацкім музеі.**

# Гульня ў акцэнты на “шчыгрынавай скуры”

Васіль Касцючэнка — жывапісец з адметным поглядам на акаляючы свет, з выразнай, толькі яму ўласцівай, манерай пісьма. Жывапіс для яго — гэта спосаб даследавання свету, пошук архетыпаў, выяўленне першаасноў быцця. Колер, святло, рытм — гэта і ёсць першаасновы, тое, без чаго не існуе свет і на чым будуе свае кампазіцыі Касцючэнка. Вельмі складаныя, але так улюбёныя ім спалучэнні зялёнага і чырвонага вандруюць па палотнах у неверагоднай колькасці адценняў і варыяцый. Часам яны становяцца абсалютнай дамінантай, запаўняючы ўсю прастору палатна, бывае — збіраюцца, сцягваюцца, быццам “шчыгрынавая скура”, у невялікія плямы, якія ў некаторых кампазіцыях выконваюць функцыю акцэнтаў, а ў іншых — дапаможную, фонавую.

Складаны, напружаны рытм сваіх палотнаў жывапісец будуе, у асноўным, за кошт гульні з рознымі масамі колеру. Аголенасць, нават пэўная экзальтацыя пачуццяў аўтара трансфармуецца на прасторы карціны ў экспрэсіўную, пульсуючую пластыку. Але пры выразна акрэсленай і ўсёпранікальнай пачуццёвасці ў жывапісе Касцючэнкі падаецца зусім не другасным інтэлектуальны пачатак, які выяўляецца ў добра прадуманай, гарманічна адладжанай пабудове прасторы палатна — фармальнай і сімвалічнай.

Стыль мастака даволі лаканічны, кампазіцыі яго не перагружаны дэталямі. Гэта дапамагае “чытаць” работы майстра адразу, выяўляючы іх цэласнасць і адзінства. Карціна для яго — гэта перш за ўсё гарманічна пабудаваная плоскасць. Падкрэслены дэкаратывізм, абагульнены, нават грубаваты малюнак, павышаная ўвага да формы і аслабленая ў дачыненні да сюжэтнасці — такія рысы творчага метаду характарызуюць Васіля Касцючэнку як мастака з сучасным бачаннем свету, адметнай стылістыкай і выяўленчай мовай.

**Фёдар ЯСТРАБ**

В.Касцючэнка. “Папараць-кветка”.

# Аранжыроўка кантрапункта

**Галерэя Тызенгауза працягвае добрую традыцыю прэзентацыі новых імёнаў у беларускім жывапісе гродзенскаму гледачу. Гэтым разам маладая мастачка з Мінска Алена Іванова прадставіла сваю першую персанальную выстаўку: серыю яркіх, насычаных і, у той жа час, надзвычай тонкіх работ, якія падкупляюць асаблівай чароўнасцю і высокім прафесійным узроўнем выканання.**

А.Іванова. “Мелодыя колеру”.

Стрыжнем экспазіцыі з’яўляецца жаночы вобраз, які быццам прыйшоў са свету казачных летуценняў і мар. Гэта сучасная амазонка, упэўненая ў сабе і, у некаторай ступені, непрыступная ў сваёй дасканаласці. Выразная, поўная ўнутранай экспрэсіі і містычнай тайны, вытанчана-манерная і абавязкова — пераможца, яна, у той жа час, надзвычай адзінокая. Нездарма практычна ў кожнай карціне, як кантрапункт, абавязкова прысутнічае своеасаблівы прыцягальны матыў, суадносны з класічнымі прыёмамі спакусы — музыкай, спевамі і аголенасцю. У іх — шматзначнасць нявыказаных пачуццяў, што крыху прыадкрываюць “вялікую тайну” жанчыны, у якой, аднак, можна прасачыць вытанчанасць і крохкасць жаночага светаадчування.

Толькі ў адной карціне мастачка дазволіла зняць цяжар адзіноты: у сюжэце ціхамірнага сну дваіх, азораных ззяннем месяца. Тонка суаднесеныя колеры ствараюць лірычную мелодыю, дзе Ён і Яна — у клопаце і даверлівасці — зліваюцца ў адзінае цэлае, тым самым ператвараючы карціну ў своеасаблівую сюіту, якая апявае найбольш важныя, на погляд аўтара, чалавечыя каштоўнасці. Мусіць, менавіта такім, на ўзроўні падсвядомасці, шчасце бачыцца большасці людзей.

Віртуозна валодаючы фармальнымі жывапіснымі рашэннямі, арганічна спалучаючы іх з дасканалай апрацоўкай асобных элементаў і ледзь намечаных дэталей канкрэтных вобразаў, мастачка ператварае жывапіс у цудоўна аранжыраваную, экспрэсіўную, візуальна-музычную дзею, якую абрынае на пачуцці гледача, выклікаючы ў яго самыя розныя пазітыўныя эмацыянальныя водгукі.

**Наталля ПАЎЛЕНКА, мастацтвазнаўца**
**Гродна**

# Mandolinis-SIM-ка

**Адной з адметнасцей сёлетняй "Мінскай вясны" стала ўпрыгожанне яе Міжнароднымі днямі мандалінна-гітарнай музыкі "Mandolinissimo". Тыя тры вечары змясцілі столькі разнастайных уражанняў, ахапілі такі шырокі разгорт стылёвых кірункаў (ад барока да джаза), сусветна вядомых імёнаў і нацыянальных школ (ад заходнееўрапейскіх да лацінаамерыканскіх і ўсходніх), тэмбравых спалучэнняў (сольна, дуэтам, аркестрам, сола з аркестрам, у ансамблі), форм выступлення (ад канцэртавання да майстар-класаў і творчых сустрэч), што "Mandolinissimo" стала падобна на своеасаблівую SIM-картку: памеры — мінімальныя, аб'ём інфармацыі — максімальны.**

## Ціха граеш — далёка чуваць

Мандаліна і класічная гітара (не блытаць з электра-) ніколі не заравуць голасам праслаўтых трох трамбонаў, што, як вядома, могуць заглушыць любы аркестр. Але голас беларускіх мандаліністаў добра чуваць ва ўсім свеце. Асаблівасцей тагачаснага выканання, штрыхавой тэхнікі — гэта дапамагае знайсці "код да Баха".

Мікалай Марэцкі (мандаліна), Масанобу Нішыгакі (гітара).

І гэта прытым, што мандаліністаў у Беларусі не так і шмат: музычны інструмент з багатай еўрапейскай радаслоўнай, упершыню завезены ў Гродна толькі ў канцы XIX ст., распаўсюджваецца ў нашай краіне павольнымі тэмпамі. Але тыя, хто ўзяў яго ў рукі хоць аднойчы, імкнуцца не развітацца з ім ніколі. Можа, ягоная прыцягальнасць — у мяккасці, пяшчотнасці тэмбру?

З асобай цеплынёй сустракала публіка музыкантаў нашай нацыянальнай выканальніцкай школы: не толькі Мікалая Марэцкага — старшыню Асацыяцыі і яго нядаўнюю выпускніцу Наталлю Корсак, але і Аліну Сакалоўскую, якая зараз жыве і працуе ў Таліне, Кацю Пракопчык і Яна Скрыгана, якія прадоўжылі адукацыю і творчую кар'еру ў Германіі.

## Бандалін у кустах

Мандаліна і гітара прайшлі вялікі шлях развіцця, частка якога знайшла ўвасабленне ў фестывалі. Тая ж Каця Пракопчык грала таксама на старадаўняй барокмандаліне. А Рыкарда Сандавал з Венесуэлы прывёз з сабой народны інструмент сваёй краіны — бандалін. Праўда, зайграць на ім у канцэрце так і не адважыўся. Паводле яго слоў, яму падалося, што бандалін, у адрозненне ад мандаліны, не надта спалучаецца з гучаннем Дзяржаўнага камернага аркестра пад кіраўніцтвам Пятра Вандзілоўскага. Але ў прыватных размовах Р.Сандавал з апантанасцю распавядаў, якія бандаліны вырабляе ягоны бацька, вядомы на радзіме інструментальны майстар. Дый без гэтых аповедаў можна было здагадацца пра наяўнасць "бандаліна ў кустах": настолькі адметнай, абсалютна не падобнай на традыцыйную, была сама манера ігры венесуэльскага госця. Мандаліна ў руках Рыкарда набліжалася па гучанні да банджа, ён нават трымаў яе зусім іначай, не гаворачы ўжо пра нацыянальныя выканальніцкія прыёмы.

Японскія музыканты гітарыстка Ака Іта і асабліва — сусветна вядомы гітарыст, кампазітар, аранжыроўшчык і нотны выдавец Масанобу Нішыгакі дэманстравалі гэткую інструментальна-імпрэсіянісцкую нірвану — абсалютнае паглыбленне ў таямніцы падсвядомасці самога інструмента і, тым больш, музыкі. Французскія госці Сабіна Марзэ (мандаліна) і Маціяс Калле (гітара) гралі быццам "для сябе". А ўсе нашы — выключна "на публіку", дасылаючы ў залу адкрытасць душы і пачуццяў. Нават філасофска-засяроджаны Ян Скрыган абавязкова прызапашваў для слухачоў пэўныя эфекты — хай не знешнія, а ўнутраныя, быццам прыхаваныя, што мільгалі бліскавіцай, бы пунсовая падшэўка яго строгага чорнага фрака.

Склаліся пад час фестывалю і інтэрнацыянальныя дуэты — беларуска-японскі, беларуска-эстонскі, інтэрнацыянальны беларуска-французска-венесуэльскі квартэт, у якіх музыканты без цяжкасцей знаходзілі агульныя кропкі сутыкнення. А ў фінале ўсе госці з радасцю і бляскам у вачах уліліся ў склад Мінскага мандалінна-гітарнага аркестра на чале з Яраславам Валасюком. Дый сама атмасфера на фестывалі была папраўдзе "сямейнай" — дастаткова сказаць, што ніводзін з зорных выканаўцаў не чакаў свайго выхаду ў закуліссі, а да апошняга слухаў сваіх калег у зале.

Каця Пракопчык (мандаліна), дырыжор Пётр Вандзілоўскі.

## Алё! Гаворыць кампазітар!

Нашы аўтары аказаліся на фестывалі ў суквецці класікаў розных эпох і краін. І — з годнасцю вытрымалі гэтае неафіцыйнае "спаборніцтва".

Віртуозны двухчасткавы цыкл "Pro et contra in D" Уладзіміра Каральчука для мандаліны і камернага аркестра, гулліва жартоўная п'еса Уладзіміра Кур'яна "На скрыжаванні", тонкія джазавыя кампазіцыі Андрэя Шпянёва ў выкананні "Transformer group" (Беларусь). Недзе ў паветры гэткім "прывідам Барбары Радзівіл" луналі і дзівосныя творы Галіны Гарэлавай, напамін пра якія выклікала само з'яўленне на сцэне Я.Скрыгана і К.Пракопчык. Мяркуючы па тым, з якой зацікаўленасцю сачылі нашы творцы за фестывальнымі падзеямі, да наступнага "Mandolinissimo" трэба чакаць новых кампазіцый. Даслаў жа нам свой падарунак Амільтон Холанда з Бразіліі — прысвечаную нашаму фестывалю п'есу "Бразільскі сувенір". Дый наш У.Кур'ян літаральна праз некалькі дзён пасля фэсту напісаў новую п'есу для мандаліны і гітары — "Дзве пяцёрачкі". Значыць, будуць і надалей шматлікія беларускія музычныя сувеніры і падарункі, натхнёныя "мандалінай, гітарай і басам".

**Фота Аляксандра ЛАБАДЫ**

# "Дырыжоры" і не толькі...

**У мінскім клубе імя Ф.Дзяржынскага адбыўся святочны вечар, прысвечаны 50-годдзю дзіцячай музычнай школы № 4.**

З нагоды юбілею ў зале сабраліся навучэнцы і выкладчыкі ўстановы, яе выпускнікі. Па словах дырэктара ДМШ № 4 Наталлі Ляжнёвай, пяцьдзесят высокапрафесійных выкладчыкаў і канцэртмайстраў даюць выхаванцам пачатковую адукацыю, далучаюць дзяцей да лепшых узораў нацыянальнай і замежнай музыкі. Асаблівая ўвага надаецца калектыўнаму музіцыраванню. Добра вядомы харавы калектыў, якім кіруе заслужаны работнік культуры краіны Інеса Вінаградава. У 1994 годзе камерны хор "Мы — дырыжоры" атрымаў ганаровае званне "ўзорны" і штогод пацвярджае яго, выступаючы ў канцэртнай зале Белдзяржфілармоніі.

За паўстагоддзя існавання школа выпусціла больш чым 3000 навучэнцаў. Каля 200 з іх сталі прафесійнымі музыкантамі і працуюць выкладчыкамі і канцэртмайстрамі ў розных установах культуры і мастацтва Беларусі. Сярод іх — загадчык кафедры гісторыі музыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, кандыдат мастацтвазнаўства Э.Алейнікава, дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў У.Угольнік, салістка Нацыянальнага аркестра народных інструментаў імя І.Жыновіча, лаўрэат міжнародных конкурсаў Ю.Высоцкая, выкладчык кафедры тэорыі музыкі БДАМ, кандыдат мастацтвазнаўства А.Снытко… Некаторыя з былых выпускнікоў звязалі прафесійную дзейнасць з роднай школай. Сярод іх — Т.Халадзенкава, Л.Нікончык, Ю.Высоцкая, Д.Орсік, П.Ліхавец...

Вечарына распачалася творам "Здравіца" ў выкананні скрыпачоў старэйшых класаў. Сваё майстэрства паказалі выпускнік школы, лаўрэат міжнароднага конкурсу, стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі В.Літвін, які выканаў "Канцэртную п'есу", выхаванец вучылішча імя М.Глінкі І.Кіклевіч.

А напярэдадні падзеі ў самой школе адбыўся "круглы стол", прысвечаны гісторыі ўстановы і пераемнасці традыцыі музычнага выхавання.

**Н.К.**

**Фота Юрыя ІВАНОВА**

**На здымку: выпускнік ДМШ № 4, тэлевядучы Яўген Лашкоўскі разам з юным навучэнцам школы.**

# Код да Баха: магілёўская прапіска

**Магілёўская гарадская капэла даўно ўжо стала заўсёднікам амаль усіх музычных святаў, што праходзяць у абласным цэнтры. Але ёсць у калектыву і свой "фірменны знак" — Фестываль музыкі І.С. Баха, які ўжо пяць гадоў запар прымяркоўваецца да дня нараджэння вялікага генія.**

Без Баха ўявіць музычную культуру ўвогуле немагчыма — не толькі ў сусветных маштабах, але і на ўзроўні пачатковага навучання: праз выкананне яго твораў "праходзіць" кожны музыкант, незалежна ад спецыяльнасці. Праўда, дасягнуць глыбінь разумення яго таямніц дадзена не кожнаму. Добра ўсведамляючы гэта, мастацкі кіраўнік капэлы Сяргей Лішчэнка звяртаецца да творчасці І.С. Баха пастаянна: каб кожны з удзельнікаў калектыву знайшоў, нарэшце, "свайго" Баха. Яны перайгралі-пераспявалі ледзь не ўсе бахаўскія аркестравыя, харавыя творы. Чатыры гады таму ўзнялі нават бахаўскія "Страсці па Матфеі" — у Беларусі твор прагучаў упершыню.

— Бах для мяне — кумір, — усміхаецца Сяргей Юр'евіч. — Ён невычэрпны, у яго творах шораз знаходзіш штосьці новае. Я шмат займаўся вывучэннем нямецкага барока, асаблівасцей тагачаснага выканання, штрыхавой тэхнікі — гэта дапамагае знайсці "код да Баха".

Невыпадкова на рэпетыцыях дырыжор звяртае ўвагу на асэнсаванасць выканання, тэмбравую і штрыхавую зладжанасць, бахаўскую пульсацыю (для С.Лішчэнкі, як я заўважыла, увогуле больш важкім складнікам выканання з'яўляецца менавіта пульсацыя, а не проста тэмп).

Дырыжыруе Сяргей Лішчэнка.

— Яшчэ большую актуальнасць, — працягвае С.Лішчэнка, — набыла творчасць Баха для ўсіх магіляўчан, калі наш горад стаў пабрацімам нямецкага Айзенаха — радзімы кампазітара. Летась у фестывалі ўдзельнічалі тамтэйшыя музыканты, і Магілёву быў падораны бюст Баха — ён усталяваны ля нашага музычнага вучылішча.

За 20-годдзе свайго існавання капэла таксама стала "амаль навучальнай" установай (праўда, без выдачы дыпломаў), бо салісты-вакалісты "гадуюцца" непасрэдна ў калектыве — з адораных вакальнымі данымі інструменталістаў. А разам з Магілёўскім абласным мастацкім музеем імя П.Масленікава капэла выхоўвае "прафесійных", калі можна так сказаць, слухачоў: дзякуючы пастаянным сумесным праектам, у музеі сфарміравалася свая суполка наведвальнікаў-меламанаў, а сам ён стаў адной з вядучых камерных залаў горада.

— Капэла ў нас літаральна "прапісалася", — расказвае дырэктар музея Аляксандр Хахракоў (дарэчы, колішні выпускнік Магілёўскага музычнага вучылішча па класах баяна і дырыжыравання народным аркестрам). — У нас добрая акустыка, для слухачоў мы набылі ўтульныя крэслы, для музыкантаў — асвятленне да пультаў, і музыка тут гучыць, нават калі ідзе змена экспазіцыі. Хочам яшчэ набыць арган і адкрыць у музеі арганную залу, а ў перспектыве — стварыць адпаведную школу, падрыхтаваць плеяду магілёўскіх арганістаў.

**Фота аўтара**

**21 мая заслужаная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Валянціна Петрачкова адсвяткавала сваё сямідзесяцігоддзе. У Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа яна працуе з 1958 года, куды прыйшла адразу ж пасля заканчэння студыі. На гэтай сцэне сыграла больш за дзвесце роляў. І заўсёды ёй было мала ўвасобленых вобразаў, часу, праведзенага перад гледачамі.**

# Неэпізоды з тэмпераментам

## Дзвесце роляў: гэта шмат ці не?

Сама Валянціна Цімафееўна неяк прызналася: "Усе мы, акцёры, жадаем працаваць. І ў мяне ёсць нясыграныя ролі. У маладосці я брала п'есы, перапісвала ролі. Рэжысёр мне казаў: "Валя, ты ніколі не будзеш гэта іграць", — а я вучыла тэкст. Калісьці мне хацелася ў лірычнай драме сыграць, калісьці — у дэтэктыве. А зараз хочацца сказаць гледачу штосьці вельмі важнае. Па-мойму, маю на гэта права".

На Коласаўскай сцэне Валянціна Петрачкова сёння ператвараецца то ў знаходлівую няньку Феліцату ("Праўда — добра, а шчасце лепш" А.Астроўскага), то ў заклапочаную смяшлівую маці Еўдакію Піліпаўну ("За двума зайцамі" М.Старыцкага), у дух манастыра Урбену ("П'емонцкі звер" А.Курэйчыка), бескарыслівую самаахвярную Памэлу ("Дарагая Памэла Кронкі!" Д.Патрыка) або ціхмяную Старую ("Млын" А.Дударава).

У 1958 годзе ў вучэбным журнале народны артыст Беларусі, кіраўнік студыі тэатра імя Якуба Коласа Цімох Сяргейчык запісаў: "З Петрачковай атрымаецца адметная вострахарактарная актрыса. Яна зойме пачэснае месца ў Коласаўскай трупе". І сёння пра актрысу распавядаюць творцы, якім пашчасціла працаваць разам з ёй.

**Антон ГРЫШКЕВІЧ, рэжысёр:**

— Валянціна Цімафееўна Петрачкова для мяне — актрыса асаблівая. Сапраўдная беларуская актрыса! Яна — увасабленне дабрыні, мудрасці, сціпласці і адданасці тэатру. І пры гэтым мае непадробнае, глыбіннае, народнае пачуццё гумару, тэмперамент і вастрыню ўспрыняцця, неабходныя для сцэнічнага існавання яе гераінь. Сабрала і захавала яна ў сабе лепшыя традыцыі Коласаўскага тэатра, якому ніколі не здраджвала.

Нашы сумесныя работы — "Крэслы" Э.Іанэска, "Дарагая Памэла Кронкі!" Д.Патрыка — у многім былі "натхнёныя і адухоўленыя" ёю. Былі яшчэ "Пакрыўджаныя" Л.Родзевіча, "Любоўны карагод" А.Шніцлера, дзе яна заўсёды іграла больш, чым "эпізоды". Напарадзе — "Ціхая ноч" Г.Мюлера, і я спадзяюся на шчаслівы працяг.

**Валянцін САЛАЎЁЎ, акцёр:**

— Адметнасць яе асобы распазнаецца па простасці і шчырасці ва ўсім: паводзінах у жыцці, узаемаадносінах з людзьмі, адносінах да прафесіі. Тэатр для Валянціны Цімафееўны — не забаўка, а месца споведзі перад людзьмі. Сапраўдны талент, як правіла, не крыклівы, не "паказушны". Я вучуся ў яе глыбокай пранікнёнасці ў рабоце над вобразам і простай форме выяўлення. З надзеяй чакаю магчымасці быць яе партнёрам на сцэне ў чарговым спектаклі.

**Віктар ДАШКЕВІЧ, акцёр:**

— Яна "выросла" на маіх вачах. Першая работа, якая вельмі ўразіла: Маслячок у "Сыраежцы". Потым былі Еўга Бабук у "Званах Віцебска", Ганна ў "Вечары" — дарэчы, за гэты вобраз актрыса была ўдастоена Дзяржаўнай прэміі БССР у 1986 годзе.

Я з цеплынёй узгадваю нашу сумесную работу ў спектаклі "Званы Віцебска" ў 1974 годзе. Мяне вельмі ўразіла яе самааддача. Рэпеціравалі па начах, стараючыся спасцігнуць гэты складаны і вельмі цікавы матэрыял… Зрэшты, яна скрупулёзная і ўніклівая заўсёды, дзякуючы чаму ў яе і няма "прахадных" работ: Петрачкова цэніць самую маленькую ролю і абавязкова зробіць з яе "цукерачку".

**Генадзь ГАЙДУК, акцёр:**

— Я вельмі задаволены тым, што мне пашанцавала працаваць на сцэне ў ролі яе мужа ў спектаклі "За двума зайцамі". Вельмі неблагая "жонка"! У "Маскоўскім хоры" быў ейным "зяцем". Скажу шчыра: і "цешча" добрая! Асаблівае задавальненне атрымліваў, калі мы працавалі з ёй у казках. Уявіце: яна — Маслячок, а я — Маслёнак у "Сыраежцы". У "Прыгодах з чароўнай скрыначкай" я — вучань Бураціна, а яна — настаўніца Баба-яга. У казках яе ніхто не перайграе. У "Трох гадзінах на сачыненне" яна — настаўніца, а мы — вучні выпускнога класа. З вялікім задавальненнем працаваў у яе юбілейным спектаклі "Дарагая Памэла Кронкі!". Яна — не фанабэрыстая заслужаная артыстка, а ласкавая маці для артыстаў, клапоціцца пра кожнага. А як хвалюецца пра ўласнага сына Васіля! Аднойчы паехалі мы разам па грыбы. Шмат назбіралі. Разышліся на нейкі час. І раптам бачу: вяртаецца Валянціна Цімафееўна з грувасткімі кошыкамі, поўнымі грыбоў, а ззаду ідзе Васіль з пустымі рукамі. Я пытаюся: "Што вы робіце?" А яна ў адказ: "Васілю нельга цяжкае насіць, ён жа на скрыпцы грае!" У гэтым яна ўся.

**Ніна ЛЕВАШОВА (КУЛЯШОВА), актрыса:**

— Яна прайшла складаны лёс: працавала прыбіральшчыцай у педагагічным інстытуце і адначасова вучылася ў студыі тэатра, адна выгадавала добрага таленавітага сына Васіля. Але, нягледзячы на ўсе цяжкасці, па натуры Валянціна заўсёды застаецца вясёлым чалавекам: раней мы сядзелі ў адной грымёрцы, разам спявалі, шмат смяяліся. Яна дапамагала і мне гадаваць дзяцей: калі Вольга ці Жэнька хварэлі, прасіла Валю выручыць. Аднойчы пакінула сына з ангінай. Жэнька капрызіў, увесь у кампрэсах. Вяртаюся з работы — а яны разам з Валянцінай "Цыганачку" танцуюць!

А яшчэ, нават у самыя цяжкія матэрыяльна часы, Валя абавязкова выпісвала "Иностранную литературу", і калі там з'яўляліся цікавыя артыкулы ды творы, абавязкова давала іх і іншым артыстам пачытаць, так што часам тыя часопісы "зачытвалі" літаральна да дзірак.

**Тамара ШАШКІНА, заслужаная артыстка Беларусі:**

— Валю Петрачкову мы з мужам, народным артыстам Беларусі Георгіем Дубавым, вельмі любім. Калі я ў 1971 годзе ішла ў бальніцу на аперацыю, то наказвала Дубаву: "Як са мной што здарыцца, бяры шлюб толькі з Валянцінай".

**Ларыса АНТОСЕВА, актрыса:**

— Гэта дзівосная жанчына і вельмі таленавітая актрыса. З добрым сэрцам, з душой дзіцяці, з вачыма клоуна. Валянціна Петрачкова ў ролі Ганны ў "Вечары" — гэта маё першае ўзрушэнне ад Коласаўскага тэатра. Дзякуючы ёй, я літаральна закахалася ў гэты паэтычны, цудоўны, непаўторны, адзіны ў свеце тэатр імя Якуба Коласа. Дай Бог ёй здароўя, шчасця, мацярынскага і творчага натхнення!

**Занатавала Святлана ДАШКЕВІЧ, загадчык літаратурнай часткі тэатра імя Якуба Коласа**

**На здымках: сцэна са спектакля "Дарагая Памэла Кронкі!"; Валянціна Петрачкова ў ролі Урбены ў спектаклі "П'емонцкі звер".**

# Прэрыя для караля... пінг-понгу

**Апошнім веснавым месяцам культурная праграма пасольстваў замежных краін у Беларусі аказалася сканцэнтраваная на кінематографе.**

З 18 па 22 мая ў сталічным кінатэатры "Перамога" Пасольства Злучаных Штатаў Амерыкі прадставіла фестываль дакументальнага кіно. У яго праграму увайшлі фільмы на самыя розныя тэмы: ад пытанняў аховы навакольнага асяроддзя да міжасобасных адносін. Гледачы ўбачылі такія стужкі, як "Першыя крокі ў кіно" — пра чатырохгадовую дзяўчынку, якая марыць стаць рэжысёрам; "Страчаныя ландшафты Амерыкі: высакатраўная прэрыя" — пра ландшафтна-тэрытарыяльныя і экалагічныя змены, што адбыліся з часоў з'яўлення на амерыканскім кантыненце першых перасяленцаў; "Аутызм: мюзікл", дзе паказаны дзеці-аутысты, што цягам паўгода рыхтавалі музычную пастаноўку. У цэнтры ўвагі "Спадарожнікаманіі" аказаліся штучныя спадарожнікі Зямлі, а ў карціне "Нота за нотай: вытворчасць раяляў Steinway L1037" — знакамітая марка музычных інструментаў. Яшчэ адну стужку фестывальнай праграмы — фільм "Праект Кашмір", у полі зроку якога — больш як пяцідзесяцігадовы канфлікт паміж Індыяй і Пакістанам, прадставілі спецыяльна запрошаныя ў Мінск кінематаграфісты Сандра Руч і Гіта Патэл. Між іншым, 21 мая госці сталіцы выступілі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

З 26 па 29 мая Пасольства Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь запрашае на Дні ізраільскага кіно, якія пройдуць у кінатэатры "Цэнтральны". Гледачы змогуць паглядзець ваенную драму "Бафор" — пра падзеі 2000 года на поўдні Лівана ў апошнія дні ізраільскай акупацыі (карціна была адзначана прызам за лепшую рэжысуру на Берлінале ў 2007 г. і намінавана як лепшы замежны фільм на прэмію "Оскар" у 2008 г.), трагікамедыю "Трагедыі Ніны" — пра клопаты маладой жанчыны і ўменне пераадольваць жыццёвыя нягоды, а таксама стужку "Сябры Яны". Героямі апошняй становяцца перасяленцы з былога СССР, у тым ліку і сама Яна, якой даводзіцца рабіць першыя крокі ў новай, зусім невядомай ёй краіне. А 28 мая адбудзецца Дзень дакументальнага кіно. У "Цэнтральным" пакажуць стужкі "Вось так бывае", "Джэні і Джэні", "Блэк-аут" і "Першая алімпіяда маёй маці".

А вось у якасці веснавой дамінанты Дзён культуры Швецыі, якія праходзяць з 20 мая па 17 чэрвеня, абраны ажно тры накірункі: кінематограф, музыка і літаратура. У прыватнасці, у рамках Фестывалю сучаснага шведскага кіно ў Мінску і Магілёве будуць паказаны чатыры мастацкія фільмы: "Вечныя імгненні Марыі Ларсан", "Воўк", "Кароль пінг-понгу" і "Па вышэйшай волі".

**Ул. інф.**

**На здымку: кадр з фільма "Сябры Яны".**

# Аўтарскі пачатак на сваёй "Баразне"

**Першае знаёмства мінскай публікі з творчасцю Лешака Мондзіка і Пластычнага тэатра Люблінскага каталіцкага універсітэта адбылося пры вельмі нязвыклых абставінах. Групкі гледачоў мітусіліся па ўнутраным дворыку Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, не надта даючы веры, што ўваход у імправізаваны тэатр — за непрыкметнымі жалезнымі дзвярыма гаража. Зрэшты, яго пашарпаныя сцены сталі ідэальным антуражам для спектакля "Баразна" — з ягонай нібы знарокавай тандэтнасцю выкарыстаных матэрыялаў і прастатой выяўленчых сродкаў. Аднак, як выявілася, невялікага набору простых рухаў было дастаткова для стварэння крохкай метафізічнай прасторы, здатнай пасапраўднаму зачароўваць.**

Выходзячы пасля спектакля на дождж, гледачы не спяшаліся дзяліцца сваімі інтэрпрэтацыямі ўбачанага: уражанні хацелася перажыць у цішыні і на самоце. Інтэрактыўнасць спектакля заключалася не ў яго сюжэтных або пастановачных хадах, але ў тым, што ўспрыняцце мінімалістычнай дзеі вымагала ад кожнага актывацыі свайго ўнутранага свету. "Мая інтэнцыя — выклікаць уражанне, быццам мы выключаны з пэўнай рэальнасці і перанесены ў іншую, здатную спарадзіць унутры нас зусім іншы стан, чым той, які мы мелі да пачатку гэтай сустрэчы", — напісаў Мондзік у сваім праграмным тэксце "Белае і чорнае, або Цемра і святло як элемент драматургіі". Дарэчы, ілюстрацыяй апошняга тэзіса стаў спектакль "Вільгаць", таксама прадстаўлены мінскай публіцы, аснова якога — мудрагелістыя ўзаемадачыненні святла і цемры.

Пластычны тэатр Люблінскага каталіцкага універсітэта ніяк не можна назваць звышнаватарскім: тая ж "Вільгаць" мае ўжо больш як трыццацігадовую гісторыю. Напэўна, адзіны эпітэт, які можна дапасаваць да гэтага тэатра, — "аўтарскі". Карпатліва, цягам дзесяцігоддзяў, выкрышталізоўваючы свой эфемерны свет, які грунтуецца перадусім на інтуіцыі, Мондзік здолеў дасягнуць уражальных вынікаў: стварэння ўласнай тэатральнай мовы. Яе адметнасць не ў знешніх, фармальных прыёмах, але ў эстэтычным характары той умоўнасці, куды рэжысёр запрашае сваіх гледачоў.

Таму трэба меркаваць, што майстар-класы, праведзеныя Лешакам Мондзікам на тэатральным факультэце Акадэміі мастацтваў, не сталіся для будучых рэжысёраў і акцёраў марнаваннем часу. Знаёмства з адметным аўтарам карыснае не столькі ў плане засваення яго майстэрства, колькі для ўмацавання "аўтарскага пачатку" ў сабе самім.

**Ілля СВІРЫН**

**Базіс рэгіёна:** кніга — чалавек — ідэалогія

## Аптымізацыя Карэліцкай ЦБС: набыткі і пралікі

# Ці ва ўсякім пакоі — месца для бібліятэкі?

**Дзейнасць цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы любога рэгіёна накіравана на развіццё і захаванне культуры (і не толькі чытацкай!) сярод дзяцей і дарослых, на прапаганду дзяржаўнай палітыкі і ідэалогіі. Ад таго, як працуе ЦБС, наўпрост залежыць, ці атрымае чытач своечасова тое або іншае перыядычнае выданне, мастацкую кнігу. Не менш істотным падаецца і тое, якія мерапрыемствы і формы работы запланаваны і ладзяцца спецыялістамі па прыцягненні людзей да гэтых устаноў культуры, па выкананні плана платных паслуг. Бо, зразумела, акрамя культурнага, прапагандысцкага, існуе і грашовы складнік бібліятэчнай справы, які скідваць з рахунку ў сённяшніх эканамічных умовах не выпадае. Наш карэспандэнт накіраваўся ў Карэліцкі раён, дзе даведаўся, як у райцэнтры і іншых паселішчах краю наладжана праца з чытачамі бібліятэк, ці апраўдвае Карэліцкая ЦБС званне "Установа культуры года" і дыплом III ступені ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, атрыманыя па выніках леташняга абласнога конкурсу...**

1.

2.

3.

### У чаканні бібліобуса

Карэліцкая цэнтральная бібліятэка, як, дарэчы, і дзіцячая, размешчана ў будынку раённага Дома культуры ў самым цэнтры гарадскога пасёлка: даволі зручнае і ўдалае месца для такіх запатрабаваных устаноў культуры. Як расказала дырэктар ЦБС Лілія Арцюх, на сённяшні дзень у Карэліцкім раёне дзейнічае 24 бібліятэкі: акрамя вышэйназваных, ёсць Мірская гарпасялковая бібліятэка і 21 сельская. Іх агульны кніжны фонд — больш за 440 тысяч экземпляраў.

За апошнія гады, па словах Лініі Арцюх, шмат зроблена па аўтаматызацыі ўстаноў культуры. У сістэме налічваецца 19 камп'ютэраў, у 4 бібліятэках створаны мультымедыйныя цэнтры, на базе дзіцячай арганізаваны інфармацыйна-адукацыйны, выхад у Інтэрнет маюць 12 устаноў... Пры ЦБС адноўлена правядзенне Краязнаўчых чытанняў з удзелам вучоных з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Усё вышэйназванае "для даведкі" дадае і адметныя рысы ў "бібліятэчны" партрэт раёна. Але ж выніковасць працы мае быць падмацавана і эканамічна. Пацікавіўся тым, як выконваюць бібліятэкары план платных паслуг. Бо раённыя ўстановы культуры ў цэлым не справіліся з даведзеным заданнем: у супастаўных цэнах спрацавалі толькі на 108 працэнтаў.

— Усе нашы бібліятэкі з планам спраўляюцца, — запэўніла Лілія Канстанцінаўна. — Летась зарабілі больш за 12 мільёнаў рублёў. А ўвогуле ў супастаўных цэнах да ўзроўню мінулага года па аказанні платных паслуг выйшлі на 119,4%, а за першыя тры месяцы бягучага года — на 114,3%.

Вельмі здзівіўся, калі пачуў адказ. Па словах Лініі Канстанцінаўны, кожную другую нядзелю месяца бібліятэкары абыходзяць тыя вёскі... пехатой. Таму з нецярпеннем чакаюць у Карэліцкім раёне бібліобус. Як запэўніла мяне начальнік аддзела культуры райвыканкама Нэлі Матлахава, у другой палове 2009 года раён павінен атрымаць аўтабібліятэку згодна з графікам набыцця гэтых машын абласным упраўленнем культуры Гродзенскага аблвыканкама. Зразумела, што без бібліобуса мясцовым бібліятэкарам ніяк не абысціся. Але варта падумаць і пра новыя формы работы. У той, старадаўні час, Радзівілы прываблівалі ў Мір гасцей з дапамогай шматлікіх кірмашоў, а мястэчка лічылася цэнтрам рамёстваў. Дык можа, варта было б разнастаіць працу бібліятэк рэалізацыяй пэўных выраба-ў, што робяцца сіламі шматлікіх гурткоў, якія існуюць пры бібліятэках раёна? Або заняцца выдавецкай дзейнасцю? Тыя ж пашто-ўкі, календары з краявідамі Карэліччыны, Міра з ахвотай разбіралі б шматлікія наведвальнікі такіх прывабных для турыстаў мясцін... Але да такога крэатыву бібліятэчныя работнікі пакуль яшчэ не прыйшлі...

Каб і надалей прыцягваць чытачоў, кіраўніцтва ЦБС працуе і над увядзеннем новых паслуг: сёлета дадаткова ўвялі такія платныя паслугі, як выдача на дом электронных дакументаў з фондаў бібліятэкі, падбор і прагляд CD-ROM на камп'ютэры, сканіраванне дакументаў.

Акрамя новаўвядзенняў, хацелася б засяродзіць увагу на аптымізацыі ўстаноў ЦБС, праведзенай у раёне. І з тымі яе вынікамі, што, як бачыцца, далі не заўжды станоўчы плён. Калі ў пачатку 2003 года ў раёне дзейнічалі 40 бібліятэк, то з прычыны ўзбуйнення і ўвядзення мінімальных сацыяльных стандартаў іх колькасць спачатку зменшылася на 14: чатыры бібліятэкі скарацілі, дзевяць рэарганізавалі ў дамы сацыяльна-культурных паслуг, а адну перавялі ў катэгорыю "клуб-бібліятэка". У 2007 годзе былі закрыты яшчэ 2 установы: дзіцячая бібліятэка ў гарадскім пасёлку Мір і Кожаўская сельская бібліятэка.

Якім жа чынам культасветнікі абслугоўваюць тых чытачоў, хто пражывае ў вёсках, дзе скарацілі бібліятэкі? Тым больш, у раёне, дзе налічваецца амаль 160 населеных пунктаў?

### Дзецям — у падзямелле?..

Пабываў у цэнтральнай гарадской і ў дзіцячай бібліятэках Карэліччаў. У чытальнай зале гарадской бібліятэкі папрасіў знайсці для мяне ў Інтэрнеце якую-небудзь інфармацыю, прыкладам, пра творчасць земляка-карэлічаніна Янку Брыля. Бібліятэкар, на жаль, не змагла адшукаць для мяне патрэбнай інфармацыі, спасылаючыся на тое, што ў іх існуе раздзяленне працы: яна займаецца краязнаўствам і запісамі ў краязнаўчую электронную базу, а іншая супрацоўніца — пошукам інфармацыі ў Інтэрнеце. Зразумела, і сам магу адшукаць патрэбную інфармацыю ў Сеціве, але не выключаны і такі выпадак, калі па інфармацыю прыйдзе пажылы чалавек або той, хто не ўмее весці такі пошук... Дзіўная рэч! Камп'ютэрны век на двары, у бібліятэцы даўно прэйскурант на адпаведныя паслугі ўведзены, а супрацоўніца з сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі не хоча "сяброваць". Ці зразумеюць яе зацікаўленыя ў такім сервісе чытачы? Тым больш, як сцвярджае Лілія Арцюх, кожны бібліятэкар той установы, дзе ўсталяваны камп'ютэр, два разы ў квартал цягам года наведвае аднадзённую камп'ютэрную школу, што дзейнічае пры ЦБС. А супрацоўнікі Карэліцкай гарадской бібліятэкі — яшчэ і тыднёвыя прафесійныя курсы ў Мінску, у чыю праграму абавязкова ўключаюцца заняткі па авалодванні камп'ютэрам.

А вось у дзіцячай бібліятэцы — пытанне, якое перайшло яшчэ з мінулага стагоддзя. Загадчык установы Галіна Казак распавяла, што вельмі хацела б, каб з'явілася магчымасць пераехаць у асобнае памяшканне. Цяпер бібліятэка размяшчаецца ў цокальным паверсе РДК, і гэта, зразумела, не вельмі вабіць дзяцей. Па словах Галіны Іванаўны, у аддзеле культуры ім абяцалі цягам часу выдзеліць будынак пад дзіцячую бібліятэку, але справа з месца пакуль не зрушылася. Нэлі Матлахава кажа, што пераезд дзіцячай бібліятэкі ў іншы будынак пакуль не плануецца.

Сапраўды, нягледзячы на рамонт, які зрабіў дзіцячую ўстанову больш прыгожай і дыхтоўнай, цокальны паверх — гэта амаль што сутарэнні. Тым больш, як гаварылі мне бібліятэкары, даволі часта гаспадарчая група аддзела культуры размяшчае ў калідоры, па якім ідуць юныя чытачы, розны гаспадарчы рыштунак, інструменты. Дарэчы, і пад час майго наведвання ўвесь калідор быў застаўлены паліцамі, тумбамі, старымі крэсламі, якія, канешне ж, не дадавалі эстэтычнага выгляду і перашкаджалі праходу наведвальнікаў. А між тым, гэта не проста чыясьці неахайнасць. Тут уключаецца ў жыцце гаворка не толькі пра культуру побыту, але, што вельмі актуальна, шэраг нарматыўных прававых актаў, якія тычацца пажарнай бяспекі, аховы працы і г. д.

### Дыскатэка у вясковай хаце

Нагадаю, што цягам 2006 — 2007 гадоў адбывалася значнае скарачэнне ўстаноў культуры ў раёне. Клубаў і бібліятэк раней было 74, цяпер засталося толькі 52. Таму раённыя ўлады і знаходзяць выйсце ў аб'яднанні ўстаноў культуры. Так, напрыклад, робяць і ў Карэліцкай ЦБС, дзе існуе цяпер 3 бібліятэкі-клуба, 3 бібліятэкі-цэнтры зносін і адпачынку, 2 бібліятэкі-цэнтры сацыяльна-культурных паслуг. Безумоўна, амаль ва ўсіх гэтых установах праводзяцца таксама і дыскатэкі. Прычым бібліятэкар і вядучы дыскатэкі тут прадстаўлены ў адной асобе.

Пабываў у падобнай установе — Вялікаслабодскай бібліятэцы-цэнтры зносін і адпачынку. Па словах загадчыка названай установы Раісы Ракач, у сферу абслугоўвання бібліятэкі ўваходзяць 7 населеных пунктаў, дзе пражывае 700 чалавек, 260 жыхароў — у самой Вялікай Слабадзе. План платных паслуг бібліятэка ў 2008 годзе выканала.

4.

5.

6.

7.

**На здымках:**
**1. Былы будынак дзіцячай бібліятэкі ў г.п. Мір, які цяпер пустуе; 2. Мірская гарпасялковая бібліятэка; 3. Медыятэка ў Карэлічах; 4, 5. Зачынены будынак СДК у вёсцы Вялікая Слабада, дзе раней змяшчалася дысказала, і той бібліятэчны пакой, дзе яна функцыяне сёння; 6. Пералік электронных дакументаў у фондзе Карэліцкай гарадской бібліятэкі ; 7. Вялікаслабадская бібліятэка-цэнтр зносін і адпачынку; 8. У Міры частка фондаў захоўваецца не толькі ў звыклых для чытачоў і кніг памяшканнях.**

Размяшчаецца бібліятэка-цэнтр зносін і адпачынку ў звычайнай сялянскай хаце: першы, вялікі пакой заняты пад кнігі, а другі — пад кнігасховішча. Яшчэ адзін выкарыстоўваецца пад танцавальную залу. Цагляны клуб, які месціўся непадалёк ад бібліятэкі, у 2007 годзе быў зачынены. На маё пытанне, чаму ж так адбылося і чаму прыярытэт пры аптымізацыі быў аддадзены сялянскай хаце, дырэктар ЦБС патлумачыла наступнае. Будынак клуба знаходзіцца на балансе мясцовага калгаса і патрабуе вялікіх фінансавых укладанняў, неабходных для рамонтных работ. Таму, згодна з рашэннем раённага кіраўніцтва, клуб зачынілі, а танцавальная зала размясцілася ў будынку бібліятэкі.

"Дыскатэчны" пакой сапраўды невялікі: у даўжыню — крокаў з дзесяць, і ў шырыню — тры, прычым з аднаго боку ён абмежаваны печчу. Дыскатэкі пры ўстанове культуры праходзяць кожную пятніцу і суботу за даволі сімвалічную плату ў 550 рублёў. Каб разнастаіць дыскатэчную "дзялянку", Раіса Ракач у рабоце карыстаецца сцэнарыямі раённага метадычнага цэнтра, праводзіць віктарыны і тэматычныя гутаркі. Дарэчы, як запэўніла мяне дырэктар ЦБС раёна, кожны бібліятэкар-вядучы дыскатэкі пабываў у свой час на аднадзённых курсах, якія праводзяцца два разы ў квартал на працягу года, па арганізацыі і правядзенню танцавальных вечароў пры раённым навукова-метадычным цэнтры.

Названы пакой бібліятэкі выглядае крыху аскетычна: апрача апаратуры — больш нічога. На танцы прыходзяць 6 — 8, часам — 10 чалавек, а летам, калі шмат моладзі прыязджае на канікулы ў вёску, і болей. Таму, зразумела, у такім пакойчыку "разгарнуцца" ім бывае нялёгка. Таксама можна было б упрыгожыць пакой, скарыстаўшыся дапамогай наведвальнікаў, каб ён хоць крыху нагадваў дысказалу.

Па словах Раісы Ракач, спачатку ёй было цяжка працаваць і бібліятэкарам, і вядучым дыскатэкі. Дапамаглі "танцавальныя" курсы раённага метадычнага цэнтра. Канешне, не проста і цяпер. Але хто сказаў, што ў культасветніка лёгкі хлеб? Безумоўна, добра, калі такі спецыяліст папрацаваў пэўны час на пасадзе клубнага работніка і ўжо мае вопыт, як загадчыца ў вёсцы Вялікая Слабада. А калі такога досведу не стае? Здабываць яго трэба на практыцы...

## "Кветка шчасця" Аюцавічаў

Наведаў я і Аюцавічы — вёску, якая летась зрабілася аграгарадком. Пражывае ў ёй каля 600 жыхароў. Змены тут адбыліся як у населеным пункце, так і ў вясковай бібліятэцы, якую ўзначальвае Наталля Гаркавая.

У фондах гэтай, па праўдзе кажучы, узорнай бібліятэкі — больш за 10 тысяч асобнікаў кніг і часопісаў. Дзякуючы таму, што летась у бібліятэцы з'явіліся сканер, прынтэр і ксеракс, бібліятэка атрымала магчымасць аказваць запатрабаваныя платныя паслугі.

Вельмі ўразіў расповед Наталлі Іванаўны пра дзяўчыну — удзельніцу аматарскага аб'яднання "Умелыя ручкі", створанага пры бібліятэцы, — якая зрабіла "Кветку шчасця" з сямі бісерных пялёсткаў. Гэтую "кветку" дзяўчо прынесла дадому і аддало бацьку, сказаўшы, каб ён не піў у той дзень, калі будзе адрываць "шчаслівы" пялёстак... Ці ж не яскравы гэта прыклад таго, што бібліятэкарская справа — гэта не толькі кнігавыдача ды праца з фармулярамі, а і выхаванне падрастаючага пакалення?..

8.

Таксама з вялікай удзячнасцю гаварыла Наталля Гаркавая і пра вялікае фота з мастакамі, якія прайшлі вайну, змешчанае ў пазамінулым нумары нашай газеты (гл. "К" № 18 за 2009 г.). Маці Наталлі Іванаўны — былы вязень фашысцкіх лагераў, і таму кожная публікацыя на тэму вайны, кожны матэрыял пра ветэранаў Вялікай Айчыннай — гэта і яе асабісты боль... Толькі ў такога неабыякавага чалавека з'яўляюцца неабыякавыя выхаванцы.

## Равесніца Перамогі, або Дзе месціцца кнігасховішча?

Не мог не наведаць знакаміты гарадскі пасёлак Мір. Як распавяла мне загадчык Мірскай гарпасялковай бібліятэкі Таццяна Скок, установа была заснавана яшчэ ў 1945 годзе. Дзіцячая ж у Міры з'явілася крыху пазней: у 50-х гадах XX стагоддзя. У Дзень беларускага пісьменства, які праходзіў тут у 2002 годзе, былі праведзены рэканструкцыя і рамонт шматлікіх будынкаў мястэчка, сярод якіх — і будынкі абедзвюх бібліятэк.

На сёння ў гарпасялковай бібліятэцы больш за 2 тысячы чытачоў. Як і ў іншых вёсках і паселішчах раёна, найбольш запатрабаваны ў Міры такія платныя паслугі, як карыстанне камерцыйным фондам, Інтэрнет, выдача часопісаў і кніг на дом, набор і раздрукоўка тэкстаў...

Па словах загадчыцы бібліятэкі, на сённяшні дзень у фондах налічваецца каля 46 тысяч экземпляраў кніг і часопісаў. Менавіта праблема захавання бібліятэчных фондаў і выклікала ў мяне пэўныя пытанні.

Пахадзіўшы па Мірскай гарпасялковай бібліятэцы, звярнуў увагу на тое, што многія паліцы літаральна ломяцца ад кніг: дадаткова ўціснуць на іх можна хіба 1-2 кніжкі, а больш вольнага месца няма. У кнігасховішчы, куды таксама зазірнуў, стэлажы стаяць так, што даволі цяжка паміж імі прабрацца, каб адшукаць якую-небудзь кнігу. Чаму? Аказалася, справа вось у чым.

Па словах бібліятэкараў, у верасні 2006 года ў дзіцячую бібліятэку гарадскога пасёлка Мір патэлефанавалі з ЦБС і паведамілі, што, па рашэнні абласнога кіраўніцтва, іх бібліятэка зачыняецца. Фонды ж будуць размяшчацца ў будынку гарпасялковай.

А фонды не малыя — каля 20 тысяч асобнікаў. Былая загадчыца дзіцячай бібліятэкі Святлана Нячай, якая цяпер працуе бібліятэкарам дзіцячага абанемента, расказала, што жыхары Міра збіралі подпісы за тое, каб такую патрэбную ўстанову не зачынялі. Па словах Нэлі Малахавай, аддзел культуры таксама выступаў супраць закрыцця ўстановы культуры. Тым не менш, хоць і падпісалася шмат людзей, хоць і накіравалі сабраныя подпісы кіраўніцтву вобласці, справу гэта не змяніла: бібліятэка была зачынена ў лютым 2007 года.

Дзесяць тысяч асобнікаў — палова фонду дзіцячай бібліятэкі — былі перададзены ў раён, а пасля размеркаваны па сельскіх бібліятэках Карэліччыны. Каб размясціць дадатковую колькасць выданняў, гарпасялковай бібліятэцы таксама давялося ахвяраваць значнай колькасцю сваіх кніг і часопісаў: больш за дзевяць тысяч асобнікаў былі таксама перададзены ў раён. Зразумела, што колькасць дублетаў у бібліятэцы паменшала, і цяпер патрэбныя кнігі ў двух або больш экземплярах — раскоша для чытачоў.

— Дык гэта што! — кажа загадчыца Мірскай гарпасялковай бібліятэкі. — Многія кнігі, што называецца, "на руках". А калі б усе гэтыя выданні забраць ад чытачоў — дык класці іх сапраўды не было б куды!

Менавіта з гэтай прычыны ў фондах гарпасялковай бібліятэкі цяпер няўтульна і цесна. Некаторыя кнігі бібліятэкарам даводзіцца класці адна на адну ў вышыню — каб заставалася больш вольнага месца.

Здзівіўся і такому паведамленню: каб размясціць кнігі, адміністрацыі гарпасялковай бібліятэкі давялося зачыніць памяшканне адной з дзвюх... прыбіральняў і там скласці часопісы. Пабачыў тое "ноў-хаў" на свае вочы. Каменціраваць сітуацыю, падаецца, залішне.

— На маю думку, трэба было загадзя запланаваць пераезд дзіцячай бібліятэкі ў гарпасялковую, — зазначыла Таццяна Скок. — Справа ў тым, што ў 2002 годзе, калі рабілі рэканструкцыю і рамонт нашай установы культуры, да будынка прыбудавалі яшчэ адно невялікае памяшканне. А можна ж было дабудаваць больш вялікае. Тады былі б задаволены ўсе чытачы — і маленькія, і дарослыя, і месца ў такой пашыранай бібліятэцы цалкам бы хапіла і для кніг.

Канешне, і бібліятэкары, і жыхары Міра, і чытачы бібліятэкі, з якімі давялося размаўляць, шкадуюць, што дзіцячая бібліятэка зачынілася. Тым больш — і гэта, бадай, таксама красамоўны факт — будынак зачыненай дзіцячай бібліятэкі цяпер знаходзіцца на балансе мясцовай ЖКГ і... ніяк не выкарыстоўваецца.

Каля зачыненай бібліятэкі паразмаўляў з некаторымі, выпадкова сустрэтымі, жыхарамі Міра.

— Навошта яе зачынілі? Дзецям там было добра, працавала вялікая чытальная зала, яны заўсёды пачувалі сябе там, як дома, — вось меркаванне адной жанчыны. — Я і сама падпісвалася за тое, каб бібліятэку не зачынялі.

— Маглі б выкарыстаць пад што-небудзь гэты будынак, напрыклад, пад цэнтр сацыяльных паслуг, — сказала мне пажылая ўраджэнка Міра, якая жыве ў суседнім з колішнім будынкам бібліятэкі доме.

Вось такія меркаванні месцічаў. Ужо трэці год будынак, у якім, нагадаю, адносна нядаўна правялі рамонт, сумна пазірае сваімі пустымі, без фіранак, вокнамі на дзяцей, якія ідуць міма са школы. І зарастае травой дарожка, што вядзе да "забытай" установы культуры...

***

Думаецца, нікога не трэба пераконваць у тым, што бібліятэкі патрэбны не толькі ў горадзе, але і на сяле, асабліва там, дзе жыхары не маюць іншай установы культуры. Таму пераўтварэнне бібліятэк раёна ў бібліятэкі-клубы, бібліятэкі-цэнтры зносін і адпачынку, бібліятэкі-цэнтры сацыяльна-культурнага абслугоўвання з мэтай захаваць для сельскіх жыхароў установы культуры — падаецца, цалкам абгрунтаваны крок, асабліва ў сённяшніх дэмаграфічных і эканамічных умовах.

Зразумелым падаецца і тое, што сумяшчэнне спецыяльнасцей бібліятэкара і клубніка пачалося не так даўно, і маладым спецыялістам, якія прыходзяць пасля навучання ў такія ўстановы культуры, досыць лёгка працаваць паралельна на дзвюх пасадах. Ім не так складана арганізоўваць культурны адпачынак для насельніцтва, як іхнім калегам, якім давялося спасцігаць асаблівасці прафесіі не ў век найноўшых тэхналогій.

І яшчэ. Падаецца, дзіцячая бібліятэка — маючы ўласны будынак, а не сутарэнні — валодае асаблівай аурай установы, дзе падлеткі пачуваюць сябе сапраўднымі гаспадарамі, а не "загнанымі" ў кут, дзе нібыта блытаюцца пад нагамі ў дарослых. Нягледзячы на складаныя фінансавыя ўмовы, ніхто не адмяняў слоў пра тое, што дзеці — наша будучыня. Шкада толькі, што гэтую жыццёвую аксіёму трэба даводзіць сім-тым з дарослых, якія таксама калісьці былі маленькімі...

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ**
**наш спецыяльны карэспандэнт**
**Мінск — Карэліцкі раён — Мінск**
**Фота аўтара**

# Блінец ад Паліны Сцяпанаўны,

## або Тры ўражанні ад “Медуніцы”

**Пятнаццаць гадоў пры Багушэўскім РДК (Сенненскі раён) актыўна дзейнічае ансамбль фальклорнай песні “Медуніца”, якім кіруе пенсіянерка Паліна Сцяпанаўна Пядачкіна... Медуніца, дарэчы, — травяністая расліна з ружовымі духмянымі кветкамі, ад якіх — і палявая прыгажосць, і пахучая мядовая карысць. Вось і песні ў “Медуніцы” гэткія ж: і прыгожыя, і карысныя для ўсіх.**

### Так мама спявала

У рэпертуары ансамбля — мясцовыя песні. Амаль сотню з іх спявала калісьці мама Пядачкінай — Вольга Міхайлаўна. Гэты “залаты спеўны фонд” перайшоў у спадчыну дачцэ, а значыць — “Медуніцы”. Паліна Сцяпанаўна пераканала: народная песня вабіць на генетычным узроўні — згадваецца дзяцінства, вясковае вакацыйнае разняволенне пасля школьнага гарадскога тлуму, пах палявой медуніцы... “Зязюлька-зязюлька, як жывеш, матулька?..”

### Нібы пчолы на мёд

У калектыве — пяць чалавек. Кожная з пенсіянерак цікавая па-свойму. Раіса Міхайлаўна Аляксандрава выгадавала 10 дзяцей, у кожнага цяпер — вышэйшая адукацыя, свая сям’я... Раіса Навумаўна Казлова так выконвае багушэўскую кадрылю, што вачам сваім не верыш! Валянціна Мікітаўна Андронава, нягледзячы на 82 гады, — нястомная салістка “Медуніцы”. А Ніна Іванаўна Казімірава, усё жыццё адпрацаваўшы паштальёнкай, захавала шчырасць душы і ўнутраную дысцыпліну, якую ўкараніла і ў “Медуніцы”... Але ўсіх аб’ядноўвае матчына дабрыня. Таму і не дзіва, што вакол кабет ды народнай песні згуртаваліся дзяўчаткі-школьніцы. Зляцеліся, нібы пчолы на мёд. Так з’явіўся ў “Медуніцы” маладзёжны працяг.

### Пачастунак слухачу

Кожная з “Медуніц”, натуральна, — і гаспадыня спрактыкаваная, майстрыха ў гатаванні беларускіх страў. І стравы гэтыя час ад часу прэзентуюцца ўдзячным слухачам. Калі, да прыкладу, згадваюцца ў песні блінцы, дык пасля яе выканання частуюць кабеты тымі блінцамі ўвесь люд. Вось такі канцэртны “інтэрактыў”. А бліны, насамрэч, выключна смачныя!

**Я.Р.**

**Фота аўтара**

**На здымках: “Медуніца” Багушэўскага РДК у поўным складзе; кіраўнік “Медуніцы” Паліна Сцяпанаўна Пядачкіна.**

# Пасяджэнне ў “... Сарокі”

**Штогод увесну культработнікі раёна збіраюцца на пасяджэнне гумарыстычнага клуба “Стракатая сарока”. Ужо шмат гадоў клуб дзейнічае пры Раённым арганізацыйна-метадычным цэнтры аддзела культуры Столінскага райвыканкама. У сяброўскім коле работнікі ўстаноў культуры жартуюць, забаўляюцца, адпачываюць, але пры гэтым і вучацца, пераймаюць перадавы вопыт работы.**

Чарговае пасяджэнне вялі метадысты РАМЦ Валерый Шуркала і Людміла Пуляк. Напачатку — жартоўная віктарына. У адказах на пытанні з падвохам не было роўных Мікалаю Кавалёву з Асаўскога сельскага дома культуры.

“Гамбургер” з баек уласнага сачынення і анекдатычных сітуацый прапанавалі членам клуба Уладзімір Гушча з Веляміцкага і Васіль Яхнавец са Стружскага СДК. А Таісія Платніцкая з Дубайскага і Варвара Белавус са Стружскага СДК выканалі прыпеўкі і байкі. Народны драматычны тэатр “Пагарынне” Столінскага ГДК паказаў урывак з новай п’есы “Як было ў нас...”

Закончылася пасяджэнне віншаваннем. Начальнік аддзела культуры Васіль Заруба, старшыня райкама прафсаюза работнікаў культуры Людміла Пуляк, усе калегі ўшанавалі дырэктара Плотніцкага СДК Станіславу Валанцэвіч з юбілеем. Усё сваё жыццё Станіслава Васільеўна шчыравала на культурнай ніве. Яе ўстанова культуры — у ліку лепшых на Століншчыне. А сама юбілярка не ўяўляе сябе на іншым месцы і нават у вольны час прыходзіць у СДК, каб паспяваць для душы.

**Галіна ГАШЧУК**

**Столін**

**На здымку: дырэктар Плотніцкага СДК Станіслава Валанцэвіч прымае віншаванні ад начальніка аддзела культуры Столінскага райвыканкама Васіля Зарубы. Фота аўтара**

# Прэзентацыя, лялькі і праект

**Вядучы эканаміст Пінскай друкарні мае незвычайнае хобі — займаецца вырабам лялек. Марыя Лугавая — выхаванка вядомага пінскага творцы Яўгена Пулхава. Два гады таму самабытная майстрыха з поспехам прадставіла свае першыя творы ў літаратурна-музычным клубе “Свечка”, што дзейнічае ў Лунінцы.**

Не так даўно ў Пінску адбылася памятная выстаўка, прымеркаваная да 100-годдзя з дня нараджэння мастака-настаўніка Яўгена Пулхава. Марыя Лугавая прэзентавала свае лялькі. Вучні славутага настаўніка прыехалі з розных куткоў былога СССР, многія з’яўляюцца дызайнерамі і архітэктарамі ў самых розных краінах. Сярод іх ёсць — і члены Беларускага саюза мастакоў.

Прызнаныя мэтры не толькі выказвалі сваё захапленне работамі Марыі Лугавой, але і далі ёй карысныя прафесійныя парады. Акрыленая поспехам, пінчанка плануе і надалей працягваць працу над новымі лялькамі, а таксама ўсур’ёз задумваецца аб стварэнні музея імя Я.Пулхава.

**Ганна БАНДАРЭНКА**

**Лунінец**

# Шляхетнасць... хрызантэмы

**Гэтымі веснавымі днямі Гродзенская гарадская выставачная зала прапанавала наведвальнікам сустрэчу з творчасцю мастачкі Валянціны Брысач. Аўтарка з’яўляецца кіраўніком народнага аўтарскага аб’яднання майстроў народнай творчасці і мастакоў “Гарадзенскі каларыт”, арганізатарам штогадовых мастацкіх пленэраў на Аўгустоўскім канале.**

Валянціна Брысач. “Нёман улетку”.

На творчасць Валянціны Станіславаўны ўплываюць вандроўкі па маляўнічых мясцінах Прынямоння. Мастачку заўжды натхняюць родныя краявіды. На яе карцінах бачыш і адноўлены Аўгустоўскі канал, і веліч былога маёнтка Валовічаў у Свяцку, і “зачараваную” часам Каложскую царкву.

Увагу наведвальнікаў выстаўкі прыцягваюць таксама кветкавыя кампазіцыі, на якіх пераліваюцца колеры яркіх макаў і сціплых рамонкаў, гнуткіх бяразак і шляхетных хрызантэм.

А калі спыняешся ля твораў “Нёман каля Багатыровічаў” ці “Над Нёманам”, ва ўяўленні нібы ажываюць вобразы з раманаў Элізы Ажэшка, якая ў сваіх творах таксама апявала сціплую прыгажосць гэтых мясцін. Сімвалічна, што выстаўка экспануецца у зале, размешчанай на вуліцы імя славутай пісьменніцы.

**Аляксандра ДУБРАВІНА**

**Гродна**

# Паясы “на нагу”

**Як вядома, неад’емнай часткай народных строяў з’яўляецца пояс. Іх вілі, плялі на пальцах, на калодачцы, на вілачцы, на сцяне, ткалі на дошчачках, на бердзечку, на нітку, на кроснах, вязалі шыдэлкам і пруткамі.**

Ёсць на Валожыншчыне вёска Сакаўшчына, дзе жыве вядомы мясцовы народны майстар Марыя Стасяловіч. Марыя Мікалеўна зараз тчэ “на нагу”, а раней рабіла гэта пры дапамозе спецыяльнай дошчачкі з замацаванымі адпаведным чынам цвічкамі.

Свайму майстэрству Марыя Мікалаеўна навучае дзяцей: вядзе гурток ткацтва “Чароўныя паясы” ў Сакаўшчынскім СДК. У 2006 годзе яна стала лаўрэатам II Нацыянальнай выстаўкі народнага мастацтва “Жывыя крыніцы”, у 2007 — II Рэгіянальнага свята-конкурсу вышыўкі і пляцення паясоў “Умельцы”, а ў 2008 — IV свята-конкурсу майстроў ткацтва “Матчыны кросны”, што праходзіў у Старых Дарогах. Летась, у снежні, Марыя Стасяловіч атрымала званне народнага майстра Беларусі.

— Колькі сябе памятаю, паясы пляла з дзяцінства, — гаворыць Марыя Мікалаеўна. — Працавала ўсё жыццё на ферме, і толькі выйшаўшы на пенсію, вырашыла вярнуцца да любімага калісьці занятку. І ўсё атрымалася! Адкуль толькі рукі помняць усё, чаму навучыла мяне маці?! Найбольш усцешна, што мае работы патрэбны людзям і, гэта асабліва прыемна, — моладзі. У Барысаве да нас падыходзілі хлопцы, куплялі пояс, тут жа ім падпяразваліся і так хадзілі пад час свята. Значыць, не дарма я працую, хоць і баляць рукі ды спіна, бо вялікі пояс трэба вязаць за два-тры дні...

**Юрась ГАРЧАК**

# Марына плюс Ірына

**Дзе Марына, а дзе Ірына, дакладна ведае толькі маці. Справа ў тым, што дзесяцікласніцы Нараўлянскай гімназіі — блізняткі. І гэта далёка не апошняя адметнасць дзяўчат. Дырэктар РДК Марына Альховік, згадваючы клубны актыў, ніколі не забывае пра сясцёр Вінакуравых.**

Па-першае, Марына і Ірына — удзельніцы дзіцячай тэатральнай студыі пры Раённым доме культуры. Па-другое, старшакласніцы чатыры гады запар займаюцца ў гуртку эстраднай песні, які ўзначальвае мастацкі кіраўнік РДК Юрый Рослік. Выконваюць сёстры і джаз, і эстрадныя творы, спяваюць і народныя песні. Робяць гэта не па-дзіцячы віртуозна.

Начальнік аддзела культуры Нараўлянскага райвыканкама Віктар Захаранка перакананы: дзяўчаты пасля школы будуць паступаць у Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў.

**Андрэй СТАРЖЫНСКІ**

**Фота аўтара**

**Без сенсацый, але ў “залатой” дзесятцы**

# Каб такія вогнішчы не палалі...

**Гісторыя мастацтва — гэта не заўсёды музеі, энцыклапедыі і фаліянты. Найноўшая гісторыя пішацца тут і зараз, яе ствараюць на нашых вачах непасрэдныя сведкі падзей. Добра, што напярэдадні свята 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў з’явілася яшчэ адна нагода ўзгадаць падзеі з гісторыі айчыннага кіно.**

**Здаецца, не так даўно гэта было: Міхаіл Пташук здымае быкаўскі “Знак бяды”. Але вось абодвух Майстраў — пяра і камеры — няма, а стужка лічыцца класічнай. На шчасце, ёсць энтузіясты, гатовыя руплівa працаваць, каб залатая старонка беларускага кінамастацтва заставалася папулярнай, каб людзі ніколі не забываліся не толькі пра сам фільм, але і пра тых, хто яго ствараў.**

Фота Віктара ЗАЙКОЎСКАГА

## Музею Пташука — быць!

Народны артыст Беларусі Міхаіл Пташук нарадзіўся ў вёсцы Федзюкі Ляхавіцкага раёна. Тут прайшло яго цяжкае пасляваеннае дзяцінства, тут ён зняў адзін з галоўных сваіх фільмаў — “Вазьму твой боль”: тонкую псіхалагічную экранізацыю вядомага твора Івана Шамякіна. Калі амаль праз пяць гадоў надышла чарга “Знака бяды”, пытанне аб месцы здымак, канешне ж, не паўставала: невялічкі хутар непадалёк ад Баранавічаў, зямля тагачаснай гаспадаркі “Вольна-Чарніхова”.

Праз семь гадоў пасля трагічнага сыходу беларускага рэжысёра, тыя, хто працаваў з Пташуком, хто не быў знаёмы з ім асабіста, але шануе ягоную памяць, сабраліся на гасціннай Баранавіцкай зямлі.

Базавая школа ў Ніжнім Чарніхове знаходзіцца непадалёк ад месца здымак “Знака бяды”. У сонечны майскі дзень кіраўніцтва раёна, калегі аўтара карціны па кінематографе, мясцовыя энтузіясты пераразаюць чырвоную стужачку ў мемарыяльным пакоі Міхаіла Пташука. Небагатая і пакуль сціплая экспазіцыя размясцілася на другім паверсе невялікай і па-хатняму ўтульнай вясковай школы. Дакументы, фотаздымкі, выразкі з газет і часопісаў... Пэўна, няма нічога унікальнага і сэнсацыйнага, таго, чаго нельга было б знайсці ў архівах кінастудыі і бібліятэчных падшыўках. Але... Гэта першы музей, прысвечаны персаналіі беларускага рэжысёра. Больш за тое: адкрыты ў месцы здымак яго галоўнага фільма. Бо ніхто не будзе адмаўляць той факт, што “Знак бяды” не проста старонка ў творчай біяграфіі Пташука, а — сапраўдная вяршыня яго творчасці, своеасаблівая малітва за ўвесь беларускі народ.

— Нашай зямлі вельмі пашанцавала, што Міхаіл Пташук здымаў тут свае пранізлівыя стужкі, — гаворыць старшыня Баранавіцкага раённага выканаўчага камітэта Мікалай Язубец. — Аднак музей Пташука — напамін не толькі пра здымкі: гэта яшчэ адно слова пра той жах, які перажылі нашы бацькі пад час вайны. Тое, што экспазіцыя размясцілася ў школе, глыбока сімвалічна. Рэжысёр не проста рабіў стужкі пра вайну — сваімі карцінамі ён дабіваўся, каб людзі памяталі пра яе, каб ваенныя жахі больш ніколі не паўтарыліся. Таму, спадзяюся, тое, што мы цяпер бачым, — толькі пачатковы этап у стварэнні вялікага музея.

На гэта спадзяецца і ініцыятар стварэння ўстановы — дырэктар ніжнечарніхоўскай базавай школы Алег Легун. Самае галоўнае, каб справа не спынілася на паўдарозе. Нават пры своечасовай дапамозе кіраўніцтва раёна і эксперыментальнай базы “Вольна”, каб музей упэўнена замацаваўся сярод культурных каштоўнасцей і быў уключаны ў спіс турыстычных маршрутаў, патрабуецца яшчэ вялікая праца...

Фота Антона СІДАРЭНКІ

## Паплечнікі і энтузіясты

Калі пасля адкрыцця музея ў Ніжнім Чарніхове аўтобус з запрошанымі прыбыў у Вольна, у тамтэйшы Дом культуры, стала зразумела: словы кіраўніцтва — не проста словы. Нягледзячы на выхадны дзень, мясцовыя жыхары прыйшлі на мерапрыемства, прысвечанае памяці вялікага земляка. Вочы, твары, прычым

Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

найбольш — маладыя, для якіх і здымаў Пташук.... Перад паказам “Знака бяды” — кароткая сустрэча з тымі, хто прымаў удзел у здымках. На сцэне — аператар Таццяна Логінава, выканаўца галоўнай ролі Генадзь Гарбук, “твар” беларускага ваеннага кіно — акцёр Іван Мацкевіч, Марыя Захарэвіч, якая агучвала гераіню Ніны Русланавай у беларускамоўным варыянце карціны. Побач — адзін з самых актыўных аператараў сучаснага кіно, які працаваў з Пташуком над фільмам “У жніўні 44-га”, Уладзімір Спарышкоў, тэатральны рэжысёр Валерый Анісенка — даўні блізкі сябар Міхаіла Мікалаевіча.

Дарэчы, самы першы паказ “Знака бяды” адбыўся менавіта тут, у Вольне, у мясцовым Доме культуры, калісьці вельмі прыгожа аздобленым вядомым маскоўскім архітэктарам. Здаецца, нічога не змянілася з 1986 года. Нічога, акрамя таго, што Пташук не на сцэне, а глядзіць на землякоў з экрана...

— Ніколі не думаў, што Мішу Пташука і здымкі нашай стужкі давядзецца ўспамінаць ў такой абстаноўцы. — Генадзь Гарбук быў расчулены цёплым прыёмам. — Той час быў самы шчаслівы ў маім жыцці. Вялікі дзякуй тым, хто захоўвае аб ім памяць! Ведаеце, у экспазіцыі лонданскага музея кінамастацтва “Знак бяды” згаданы сярод дзесяці лепшых стужак пра вайну. Таму тое, што і ў Беларусі з’явіўся музей гэтай карціны, яе рэжысёра, — вельмі добрая навіна.

Яшчэ адзін сімвал — той самы хутар, дзе і адбываліся здымкі. Дакладней, месца, на якім хутар стаяў. Журналісты вельмі любяць пісаць: маўляў, у кіно ўсё — несапраўднае, зробленае спецыяльна для здымак. Хутар для “Знака бяды” спалілі ў кадры па-сапраўднаму, разам з пабудаванымі побач дэкарацыямі. Пад час каротkай дарогі да месца здымак усе ўспаміналі, як гаспадары, у якіх купілі хутар перад здымкамі, пасля схамяну лі і нават пагражалі падаць у суд на рэжысёра, калі даведаліся, што іх родная хаціна будзе спалена ў фінале. Але, як успамінаў Пташук, пасля прэм’еры зразумелі: іх хату спалілі дзеля таго, каб на Беларусі такія вогнішчы больш не палалі...

Дарога да месца былога хутара ідзе па полі, і ў пэўны момант аўтобус буксуе ў глыбокім пяску. Народныя артысты выходзяць дапамагчы, штурхаюць машыну наперад, да знакамітых трох дубоў, якія, як і раней, стаяць побач з былой сядзібай... Менавіта ўздоўж гэтых дубоў на хутар да Петрака і Сцепаніды рухаліся машыны з паліцэйскімі, немцамі, а раней — вазы з калгаснымі актывістамі... А вось і знакамітая гара, Галгофа, на якую Пятрок (Генадзь Гарбук) цягнуў цяжкі драўляны крыж. Ніякага крыжа цяпер тут, зразумела, няма, і адразу нараджаецца прапанова яго аднавіць. Як адбудаваць і сам хутар: хлеў, калодзеж, гаспадарскі дом. Ад іх засталіся вуголле і пячныя камяні.

Леў Аліферка ўсё жыццё працаваў на сяле, але прымаў удзел у здымках адразу дзвюх кінастужак. У 1980-м быў старшынёй калгаса якраз у родных для Пташука Федзюках і дапамагаў рэжысёру рабіць “Вазьму твой боль”. Таму калі Пташук шукаў натуру для “Знака бяды”, то звыкла звярнуўся да Льва Анатольевіча. І той, тады ўжо кіраўнік “Вольна-Чарніхова”, не задумваючыся, адразу прапанаваў вось гэты хутар. Нават фота захавалася: позняя восень 1985 года, ляжыць снег, Пташук і Аліферка стаяць на месцы будучых здымак. Там, дзе цяпер пабывалі і мы.

Зразумела, не абышлося без успамінаў. Аператар Таццяна Логінава і акцёры Генадзь Гарбук і Іван Мацкевіч аднаўляюць абставіны здымачнага перыяду. Расказваюць, як цяжка даводзілася і акцёрам, і рэжысёру з аператарам. Як пасыпалі поле суперфасфатам, каб растаяў нечаканы снег. Як выканаўца ролі Сцепаніды — вядомая актрыса Ніна Русланава цягнула ў кадры бомбу, што, дарэчы, важыла зусім як сапраўдная: каб усё было натуральным, яе абалонку напоўнілі зямлёю. Успомнілі і вясковую жанчыну, якая ў кадры даіла карову: усё ж рукі ў быкаўскай Сцепаніды — зусім не такія, як у актрысы.

Пра самую адказную сцэну — пажару — было што сказаць і аператару. Аказваецца, калі хату падпалілі, у вогнішча кінулася котка: не здолела вытрымаць знішчэння роднага кута. Котку затрымалі, і сенсацыйныя кадры не былі зняты. Але стужка атрымалася і без іх.

## У чаканні турыстаў

Ад Ніжняга Чарніхова, Вольна да былога месца здымак — усяго некалькі хвілін на машыне. Здаецца, вось вам і гатовы турыстычны маршрут, балазе і знаходзіцца ён якраз на трасе Мінск — Брэст. Тое, што паглядзець у тых мясцінах ёсць многа чаго, расказаў усё той жа Леў Аліферка, які ў свой час шмат аддаў развіццю гэтага краю. Цікава, што і цяпер эксперыментальная база “Вольна” — самая вялікая гаспадарка ў краіне: тут ёсць і жывёлагадоўчы комплекс на 10 тысяч галоў, і ўласны спіртзавод. У свой час гэтае сельгаспрадпрыемства было створана пры аб’яднанні адразу сямі панскіх маёнткаў. Гісторыя таго ж Вольна налічвае амаль 400 гадоў!

У XIX стагоддзі ў ім жыў вядомы архітэктар Рафаіл Слізень. А Ніжняе Чарніхова было маёмасцю нямецкага землеўладальніка Гарцінга. На жаль, гістарычных пабудоў тут захавалася няшмат. Вельмі цікавая царква ў Вольне, да якой прылягае парк з каштоўнымі раслінамі, што памешчыкі звезлі з розных краін свету. У Гарцінга было іншае “хобі”: ён быў калекцыянерам... піва. У 1980-я, калі пачалі перабудову рэшткаў яго маёнтка, то знайшлі цэлае скляпенне з бутэлькамі рознага калібру. Адшукалася ў калекцыі Гарцінга і прадукцыя мінскіх броварaў. Аліферка нават патэлефанаваў на адзін з іх і пацікавіўся, ці ёсць такая бутэлька ў музеі прадпрыемства. Аказалася, што няма.

Так, пра тутэйшыя мясціны можна расказваць шмат і доўга. Галоўнае, каб людзі памяталі і прапагандавалі сваю гісторыю. У Ніжнім Чарніхове і Вольне такія людзі ёсць. А значыць, госці ў іх не перавядуцца.

**Антон СІДАРЭНКА**

**На здымках: народны артыст Беларусі Генадзь Гарбук выступае на цырымоніі адкрыцця музея; кадр з фільма “Знак бяды”; на гэтым месцы здымалі сцэну ўзыходжання Петрака на мясцовую Галгофу.**

**Мусіць, маюць рацыю тыя, хто мяркуе, што гісторыя носіць цыклічны характар. 29 мая 1898 года пад гукі аркестра на вуліцы Замкавай прайшло ўрачыстае адкрыццё Гродзенскага пажарнага таварыства. Мінула роўна 110 гадоў, і там жа, пасля рэканструкцыі дома № 19, адкрылася старэйшае гарадское пажарнае дэпо.**

# "Цагляная прыгажуня" на Замкавай

## Гродзенская эклектыка сярод "афрыканскай пустыні"

Старадаўняя Гародня неаднойчы руйнавалася рознымі па сіле пажарамі. Таму за парадкам у гэтай галіне ў горадзе заўжды пільна сачылі. У другой палове XIX стагоддзя пажарны двор размясціўся ў цэнтры Гродна, непадалёк ад каралеўскіх замкаў, на месцы будынкаў былых каралеўскіх стайняў. Месца было выбрана гарадскімі ўладамі невыпадкова: побач з Замкавай пралягала вуліца Малая Траецкая са шчыльнай драўлянай забудовай, дзе ў XVIII — XIX стст. адбылося некалькі буйных пажараў, што на чвэрць спустошылі архітэктуру старажытнага горада.

Пачынаючы з другой паловы XIX стагоддзя, бадай, самым набалелым пытаннем для гарадскіх улад і пажарнай каманды заставалася пабудова высокай пляцоўкі для нагляду за "вогненнай" бяспекай у Гродне. Яно неаднаразова выносілася на разгляд Гродзенскай гарадской думы. Улетку 1870 года быў праведзены тэндэр на "устройство пожарной деревянной каланчи на казарме пожарной команды". Па рашэнні Думы, будоўляй дазорнай вежы павінен быў заняцца "купецкі сын" Гальперн. Сума, якая выдзялялася на яе будоўлю, складала 313 рублёў 49 капеек, а Гальперн гарантаваў узвесці вежу за 266 рублёў і 25 капеек, — атрымлівалася неблагая эканомія грошай. Звестак, ці гэтым купцом была пабудавана пажарная вежа, не знойдзена. Аднак выснову аб яе існаванні на гродзенскім пажарным двары паміж 1885 і 1898 гг. можна зрабіць, зыходзячы з шэрагу архіўных дакументаў і фотаздымка Яна Балзункевіча: на фота выразна бачна драўляная пабудова з дакладна акрэсленымі ярусамі, якія звужаюцца ўгору.

10 чэрвеня 1885 года ў Гродне адбылося сапраўднае стыхійнае бедства. Па сведчаннях відавочцаў, "...пажар ператварыў Гродна ў выгаралую афрыканскую пустыню". Пасля чэрвеньскіх падзей пільную ўвагу прыцягнуў дрэнны стан вежы, якая знаходзілася ў канцы Замкавай вуліцы ў вельмі нізкім месцы, адкуль была бачна толькі частка горада. З гэтай прычыны каманда не заўжды своечасова магла заўважыць пажар.

Толькі ў 1902 годзе на Замкавай, 19, побач з рэмізай, з'явілася 32-метровая вежа. "Цагляная прыгажуня", узнёсшыся на 6 ярусаў над горадам, несла на сабе выразны адбітак эклектызму. У сярэдзіне яе зрабілі вінтавую лесвіцу са 120 прыступкамі, якая пачыналася на другім ярусе будынка. На самым версе размяшчалася кругавая аглядная пляцоўка пад шатровым навесам, абнесеная ажурнай каванай агароджай. З гэтай пляцоўкі за спакоем у горадзе кругласутачна сачыў вартавы. Пры з'яўленні пажару на каланчу вывешвалі ўмоўныя знакі: днём — скураныя шары, чырвоны колер якіх сведчыў аб пажары, сіні — аб пажарнай небяспецы, а ноччу пад час пажару — ліхтары. У выпадку пажару вартавы на вежы пачынаў біць у звон, гук якога з'яўляўся сігналам для каманды. Калі пажар быў моцны, пачыналі біць набат усе касцельныя і царкоўныя званы горада.

У пачатку XX стагоддзя плошча, занятая пажарным дваром, складала 1886 кв. м. Да вежы з левага боку прымыкаў аднапавярховы будынак, дзе размяшчаліся казарма і кухня. З правага боку — вышэйшая і больш шырокая ў аб'ёме, з шасцю варотамі, аднапавярховая пабудова пажарнай рэмізы. Апошняя стаяла ўпоперак існуючай сёння дарогі і закрывала сабою праезд паміж сучаснымі вуліцамі Давыда Гарадзенскага і Вялікай Траецкай. Побач з казармай, з боку каралеўскіх замкаў, існавала невялікая аднапавярховая кузня. Сваю старую рэмізу гродзенская вежа страціла пасля Другой сусветнай вайны, а па тэрыторыі колішняга пажарнага двара праклалі адрэзак вуліцы. У 1965 — 1970 гадах да часткова ацалелага будынка старой казармы дабудавалі новы гараж, які ў 2006 годзе цалкам пайшоў пад знос. На ягоным месцы ўзнікла сучасная пажарная аварыйна-выратавальная частка пад усё тым жа, нязменным за доўгія гады, нумарам адзін.

Гродзенская пажарная вежа вытрымала выпрабаванне часам. Ёй споўнілася 107 гадоў. Сёння вежа з'яўляецца старэйшай сярод сваіх "супляменніц" на тэрыторыі сучасных Беларусі, Літвы і Польшчы. Прызначэнне яе з цягам часу змянілася. Цяпер пабудова прымае турыстаў і нясе "культурную варту" ў старым цэнтры горада: у ёй працуе галерэя "Арт-Каланча". Праз 120 прыступак на 32-метровай вышыні вежы воку адкрываюцца цудоўныя краявіды горада і яго ваколіц. Падзорная труба, уладкаваная на вонкавай аглядной пляцоўцы, дазваляе разгледзець нават самыя дробныя архітэктурныя дэталі на франтонах старых будынкаў.

**Ірына КАЧАН,**
**старшы інспектар**
**Цэнтра навучання і прапаганды**
**пры ўстанове**
**"Гродзенскае абласное**
**ўпраўленне МНС"**

**На здымках: славутая пажарная вежа; так выглядаў дазорца на вышыні 32 метры ў пачатку XX ст.; экспанаты музея ў вежы.**

# Адкуль у вёсцы дзядзінец

## Ці адшукаюць археолагі храм горада Казіміра?

**У сучасных беларускіх метэарэаліях праца па даследаванні нетраў зямлі ідзе цягам ледзь не ўсяго года. І тым не менш, менавіта вясной адкрываецца новы сезон у археолагаў. Адна з найбольш значных распрацовак — працяг працы ў Светлагорскім раёне, на месцы знойдзенага горада Казіміра, які існаваў з 1643 па 1655 год і меў, між іншым, магдэбургскае права.**

Карэспандэнт "К" вырашыў завітаць разам з вядомым археолагам, доктарам гістарычных навук і прафесарам гісторыі Сяргеем Рассадзіным у гэтыя надзвычай прыгожыя і багатыя на падзеі мінулага мясціны.

Пра былую веліч горада сёння нагадвае хіба толькі назва вёскі — Каралеўская Слабада ды ўсталяваны сёлета мясцовымі ўладамі помнік-валун, на якім у бліжэйшы час мусіць з'явіцца мемарыяльная шыльда. На першы погляд — звычайная вёска, аднак, пад'ехаўшы да цэнтра былога горада, пачынаеш разумець эстэтычныя густы і прагматычнае мысленне нашых продкаў: такія краявіды, а дакладней — ракурсы назірання за імі, наўрад ці дзе яшчэ можна знайсці.

У XVII стагоддзі, акрамя рыбнай лоўлі ў Бярэзіне, мясцовыя жыхары зарабілі сабе на жыццё гандлем і, канешне ж, рамесніцтвам, у прыватнасці — ганчарствам. Не выпадкова асноўныя знаходкі мінулых экспедыцый — гэта керамічныя вырабы, рэшткі якіх сустрэліся і пад час нашай паездкі. У гісторыкаў ёсць нават такая аксіёма: калі для селяніна вясна — час пасяўной, то для археолага — гэта перыяд актыўнага збору артэфактаў. Справа ў тым, што на ўзараных палетках адносна лёгка вызначаюцца такія прадметы. Вось і гэтым разам мы вярталіся не з пустымі рукамі. Да таго ж, знойдзеныя пры аглядзе тэрыторыі вясковых агародаў рэшткі старадаўніх прадметаў сведчаць: вакол гарадской царквы, месца якой і па сёння называюць "дзядзінцам" (а па тэрміналогіі X — XIII стст. "детинець — цэнтральнае месца горада), віравала звычайнае, але раптам спыненае, жыццё. Знойдзеныя рэшткі адносна дробныя, але і па іх можна прасачыць гісторыю горада, а пасля — і вёскі. Хаця ў гэтай мясцовасці і не сустракаюцца каштоўныя залатыя ці сярэбраныя прадметы (горад быў разбураны і разрабаваны пад час вайны сярэдзіны XVII ст.), за тое макотры, міскі, шкляны посуд, іншыя побытавыя рэчы ўкладваюцца ў тыя тыпалогіі, што тычацца менавіта згаданага часу.

Па словах Сяргея Рассадзіна, яшчэ пад час ранейшых раскопак, калі былі знойдзены рэшткі старажытнай ратушы, з'явілася меркаванне, што непадалёк мусіў быць і гарадскі храм. Дзякуючы знаёмству археолагаў з мясцовым святаром — айцом Дзімітрыем, які зацікавіўся ідэяй даследавання і добраўпарадкавання месца хрысціянскай святыні, вырашылі, што сёлета раскопкі ў Каралеўскай Слабадзе ажыццяўляюцца менавіта над царквой сумарным аб'ёмам больш за 100 квадратных метраў з адной умовай: месца за алтаром, дзе звычайна былі пахаванні, не будзе раскопвацца. Зараз археолагам неабходна толькі дачакацца архіпастырскага бласлаўлення Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта на правядзенне раскопак хрысціянскай святыні, якое практычна ўжо атрымана.

Вядома ж, адказнасць — вялікая, ды і псіхалагічна складана працаваць над рэшткамі зруйнаванага ў 1940-х гадах храма, чыя дзейнасць вядомая з XIX стагоддзя. Ёсць меркаванне, што ён быў пабудаваны ў XVIII стагоддзі на месцы раней існуючай царквы перыяду існавання горада Казіміра.

І вось якой паўстае Дабравешчанская царква (а менавіта гэтую назву яна мела ў "Описании церквей и приходов Минской епархии 1879 года"): "Время застройки приходской Благовещенской церкви неизвестно. Обновлена в 1869 году на средства правительства, отпущенные в количестве 2800 рублей. Здание было деревянное, на каменном фундаменте, в виде продолговатого креста, с тремя глухими куполами. Колокольня находилась отдельно. Кровля гонтовая и вместе с куполами окрашена в коричневый цвет. Окна в один ярус, дверей двое. Вообще, корпус здания был крепок. Внутренняя вместимость составляла 21 сажень и была квадратного расположения, дощатый потолок подшили тесом. Печей не было. Погост обнесен деревянной оградой. На колокольне 4 колокола. Самый большой в 3 пуда".

Нягледзячы на тое, што ўсё колькі-небудзь каштоўнае з гэтай царквы вынеслі, яшчэ калі яе зачынялі, на думку Сяргея Яўгенавіча, сёлета атрымаецца выявіць дастаткова цікавыя для навукі знаходкі. Галоўнае — неабходна гэтаму месцу надаць годны выгляд: наперш, прыбраць смецце і высекчы хмызняк у наваколлі храма, абазначыць дакладныя контуры царквы, каб кожны, хто трапіць у гэтае месца, змог адчуць намоленае людзьмі цягам стагоддзяў месца.

**Канстанцін АНТАНОВІЧ**

**На здымках: першыя знаходкі сёлетніх даследаванняў; рэшткі жаночага духоўнага вучылішча.**

***P.S.*** *Пакуль вядзецца плённае даследаванне старажытнага горада, у добраўпарадкаваных Парычах, яго своеасаблівым пераемніку, які мае нават герб, аналагічны гербу Казіміра, літаральна на вачах вандаламі зніштажаюцца закінутыя будынкі жаночай духоўнай семінарыі XIX стагоддзя, заснаванай жонкай дзекабрыста Міхаіла Іванавіча Пушчына — Марыяй Якаўлеўнай. Ёсць, на жаль, тыя, хто гатовы за невялікія грошы навыбіваць цаглін добрай якасці для новага выкарыстання...*

***К.А.***

**Некалькі нумароў таму наш пазаштатны аўтар Аляксандр Пацыенка прапанаваў пазнаёміцца чытачам "К" з працай партызанскіх кінаперасовак і наогул з кінаабслугоўваннем насельніцтва акупіраванай Беларусі, якое здолелі зладзіць нават у ваенных умовах партызаны і падпольшчыкі. Новы артыкул дацэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў прысвечаны "культурнаму фронту", што сілай творчасці і магутнага патрыятычнага парыву натхняў салдат на Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне.**

## Як БДТ-1 падарыў самалёт лётчыку-земляку

# Паўмільёна спектакляў і канцэртаў

### Каштоўнасці не маюць значэння?

У акупіраваных гарадах і вёсках, разам з масавымі рэпрэсіямі, гітлераўцы вялі лжывую прапаганду, у рамках чаго шырока выкарыстоўвалі друк, радыё, кіно, вусныя і наглядныя формы. Але насуперак ёй перад мірнымі жыхарамі паўставалі карціны варварскага знішчэння мастацкіх каштоўнасцей і разбурэння культурна-дасугавых устаноў. Фашысты знішчалі ці прыстасоўвалі да ваенных і гаспадарчых мэт тэатры, кінатэатры, палацы і дамы культуры, клубы, бібліятэкі, хаты-чытальні, музеі. Былі разрабаваны і разбураны ў гады вайны Беларускі дзяржаўны музей, Бабруйскі, Віцебскі і Гомельскі абласныя музеі, Літаратурны музей А.Міцкевіча ў Навагрудку, спалены Дом-музей Ф.Дзяржынскага... Гомельскі ж парк культуры і адпачынку фашысты прыстасавалі пад могілкі для салдат...

Зніштажэнне культурных устаноў было не толькі вынікам ваенных дзеянняў. Верхаводы фашызму заклікалі ў загадах і інструкцыях знішчаць культурныя каштоўнасці на акупіраваных тэрыторыях. У загадзе "Аб паводзінах войскаў на Усходзе" генерал-фельдмаршал Вальтэр фон Рэйхенаў пісаў: "Войскі зацікаўлены ў ліквідацыі пажараў толькі тых будынкаў, якія мусяць быць выкарыстаны для размяшчэння вайсковых часцей. У астатнім знікненне сімвалаў адпавядае задачам вайны на вынішчэнне. Ніякія гістарычныя або мастацкія каштоўнасці на Усходзе не маюць значэння". У выніку ў рэспубліцы за перыяд акупацыі было знішчана 550 помнікаў беларускай архітэктуры.

Гітлераўцы выкарыстоўвалі культурна-асветніцкія ўстановы нават для масавага знішчэння савецкіх грамадзян. У вёсцы Будзішча Гомельскай вобласці яны сагналі ў калгасны клуб і спалілі 27 жанчын, старых і дзяцей. У клубе Рудабельскага спіртзавода Палескай вобласці акупанты спалілі 240 жыхароў...

Акупанты пазбавілі насельніцтва магчымасці карыстацца і тымі культурна-дасугавымі ўстановамі, якія ацалелі. Моладзі забаранілі збірацца там. А нямногія клубы, адкрытыя фашыстамі ў гарадах рэспублікі, выконвалі функцыі цэнтраў гебельсаўскай прапаганды.

### Установка: рабаваць, разбураць, знішчаць...

У сувязі з хуткім адступленнем Чырвонай Арміі не было магчымасці эвакуіраваць многія культурныя каштоўнасці ў савецкі тыл. У верасні 1941 г., у сувязі з гэтым, Кубэ паведамляў Розенбергу: "...У Мінску знаходзіўся вялікі, часткова вельмі каштоўны збор прадметаў мастацтва і карцін, якія амаль цалкам вывезены з горада. Па загадзе рэйхфюрэра СС Гімлера большасць карцін <...> была ўпакавана эсэсаўцамі і адпраўлена ў Германію... Гаворка ідзе пра мільённыя каштоўнасці, забраныя ў генеральнай акрузе..."

Скарбніца беларускай культуры — Дзяржаўная карцінная галерэя — разрабавана цалкам. Гітлераўцы вывезлі з яе лепшыя карціны і скульптуры З.Азгура, І.Айвазоўскага, А.Бразера, В.Пярова, І.Рэпіна і многіх іншых. Па няпоўных даных, знікла 250 экспанатаў скульптуры, 1500 — графікі, 2000 — жывапісу...

У Беларусі знішчана і вялікая колькасць кніг. Многія тысячы экземпляраў гітлераўцы спалілі разам з бібліятэкамі. Знішчаны за гады Вялікай Айчыннай Беларуская дзяржаўная навуковая медыцынская бібліятэка ў Мінску, Гомельская абласная бібліятэка імя Герцэна і больш за 200 іншых такіх установ. У Мінску фашысты разрабавалі багацейшую навуковую бібліятэку АН БССР, урадавую імя М.Горкага, Мінскую гарадскую публічную імя А.Пушкіна, бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Політэхнічнага інстытута...

Адначасова гітлераўцы ажыццяўлялі планамерны вываз рэдкіх кніг. Каштоўныя выданні класічнай літаратуры, даведнікі, фаліянты па мастацтве, старадрукі, калекцыі рукапісаў трапілі ў Германію. Найбольш пацярпела ад рабаванняў Беларуская дзяржаўная бібліятэка імя У.Леніна.

### Амаль паўтысячы творцаў

З першых дзён вайны беларуская інтэлігенцыя актыўна ўключылася ва ўсенародную барацьбу з ворагам. На мабілізацыйных пунктах, у шпіталях, воінскіх часцях выступалі самадзейныя і прафесійныя мастацкія калектывы. Змянялі свой рэпертуар тэатры, уносіліся карэктывы ў канцэртныя праграмы... Вастрыём сатыры і плаката, зместам і эмацыянальным пад'ёмам твораў таксама наносіўся ўдар па ворагу.

У гады Вялікай Айчыннай сапраўднымі патрыётамі праявілі сябе беларускія артысты. Згадаем, што пра выступленні Першага Беларускага дзяржаўнага тэатра ў час вайны "К" падрабязна пісала ў № 19 за гэты год. БДТ-2 перад вайной гастраляваў у Карэла-Фінскай ССР. З пачаткам баявых дзеянняў трупа эвакуіравалася ва Уральск. Дзяржаўны тэатр юнага гледача вайна заспела на гастролях у Баранавічах. Арганізавана выехаць адтуль калектыў не меў магчымасці, і артысты вымушаны былі выбірацца з горада разрозненымі групамі. У такім жа становішчы апынуўся і Дзяржаўны рускі тэатр БССР, які гастраляваў у Беластоку. Пераадольваючы шматлікія цяжкасці, работнікі гэтых калектываў здолелі выбрацца ў савецкі тыл.

Беларускі дзяржаўны ансамбль песні і танца (мастацкі кіраўнік — Р.Шырма) у чэрвені 1941-га гастраляваў у Арле, адкуль калектыў пераехаў у Маскву і выступаў на прызыўных пунктах ваенкаматаў. Асноўнае ядро творчых работнікаў беларускай кінастудыі эвакуіравалася ў Алма-Ату.

Артысты, якія засталіся на акупіраванай фашыстамі тэрыторыі, намагаліся самастойна трапіць на Усход, альбо ішлі ў партызанскія атрады. Па няпоўных звестках, у лютым 1942 года ў савецкім тыле працавала больш за 450 беларускіх артыстаў, мастакоў і кампазітараў.

### Эвакуацыя — фронту

Эвакуіраваных дзеячаў культуры і мастацтва ўрад рэспублікі намагаўся накіраваць на работу па спецыяльнасці. Больш за 20 артыстаў працавалі ў Казахскім оперным тэатры. Скажам, кампазітар М.Аладаў выкладаў у Саратаўскай кансерваторыі, А.Багатыроў — у Свярдлоўскай. Малады кампазітар Г.Вагнер працаваў спачатку канцэртмайстрам у Таджыкскай філармоніі, а потым стаў загадчыкам музычнай часткі франтавога тэатра.

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр за тры гады знаходжання ў Томску даў 870 спектакляў, на якіх пабывала 747 тысяч чалавек. У дадатак дадзена больш за 200 шэфскіх спектакляў і канцэртаў. Дарэчы, у 1943-м калектыў тэатра пералічыў у фонд абароны 300 тысяч рублёў. На грошы, атрыманыя ад дадатковых спектакляў, і на асабістыя зберажэнні артыстаў быў выраблены самалёт, які перадалі лётчыку-земляку.

Жаданне быць як мага бліжэй да тых, хто змагаецца з ворагам, нарадзіла ў тэатральных калектывах канцэртныя брыгады, перасоўныя трупы з тэхнічна нескладаным, але насычаным баявым рэпертуарам. У многіх франтавых часцях пабывалі з канцэртамі артысты Беларускага тэатра оперы і балета. Вялікім поспехам у франтавікоў карысталіся выступленні салісткі тэатра народнай артысткі СССР Л.Александроўскай. У 1943 годзе ў Маскве ў якасці франтавога адрадзіўся Рускі драматычны тэатр БССР. За адзін месяц ён арганізаваў 113 канцэртаў. З часткі трупы Гомельскага абласнога драматычнага тэатра была створана канцэртная брыгада, што выступіла перад байцамі 650 разоў. У 1942-м яна была рэарганізавана ў франтавы тэатр і ў складзе 3-га Беларускага фронту дайшла да Усходняй Прусіі.

**А.Бембель. Мікалай Гастэла. 1943 г.**

Другі Беларускі дзяржаўны тэатр працаваў ва Уральску. Пасля першых спектакляў віцябчан газета "Прыуральская праўда" пісала: "Знаходжанне ва Уральску Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра прадстаўляе з сябе вялікую падзею ў культурным жыцці горада. Толькі ў кастрычніку 1941 года спектакль тэатра "Хлопец з нашага горада" паглядзела 6800 чалавек". У гады вайны тэатр выступаў у Маскве і Арэхава-Зуеве, а ўсяго за той час віцебскія артысты далі больш за 800 шэфскіх спектакляў і канцэртаў для чырвонаармейцаў. Ніякай дзяржаўнай датацыі тэатр не атрымліваў. Больш за тое: ён унёс у фонд абароны краіны больш за 100 тысяч рублёў.

Напружаны творчы рытм быў характэрны і для канцэртных арганізацый. За першыя два з паловай гады вайны Беларускі дзяржаўны ансамбль песні і танца арганізаваў 620 канцэртаў, на якіх пабывала 450 тысяч чалавек. Акрамя таго, калектыў наладзіў сотні шэфскіх канцэртаў у воінскіх падраздзяленнях.

На франтах у гады Вялікай Айчыннай вайны пабывала 3700 мастацкіх калектываў СССР з агульнай колькасцю ўдзельнікаў больш за 40 тысяч чалавек. Яны далі каля паўмільёна спектакляў і канцэртаў. У гэтых лічбах знайшоў сваё адлюстраванне і ўнёсак беларускіх артыстаў.

**Сцэна са спектакля "Фронт" БДТ-1, 1942 г.**

**Кадр з фільма "Вызваленне Савецкай Беларусі", 1944 г.**

### Пачатак аднаўлення

Шмат зрабіла Упраўленне па справах мастацтваў БССР па аднаўленні мастацкіх калектываў, якія перасталі было існаваць у гады вайны. Яно пачало наладжваць сувязі з колішнімі артыстамі беларускіх тэатраў і канцэртных арганізацый. Да красавіка 1943-га ўстаноўлена сувязь з 700 работнікамі мастацтваў Беларусі. У 1942-м была прынята пастанова па захаванні асноўнага творчага складу тэатра оперы і балета, у наступным годзе — адноўлены Дзяржаўны рускі тэатр БССР, Тэатр музычнай камедыі і Беларуская дзяржаўная філармонія.

У сярэдзіне 1943 года зноў распачынае работу Саюз кампазітараў Беларусі. Дзяржаўнае музычнае выдавецтва выдала за гады вайны 45 твораў беларускіх кампазітараў. Сярод іх — "Песня беларускіх партызан" Я.Цікоцкага, "Мы — беларусы" Н.Сакалоўскага (яна потым стала Дзяржаўным гімнам БССР) і шэраг іншых. Саюз кампазітараў арганізоўваў сустрэчы з салдатамі, аказваў дапамогу франтавой мастацкай самадзейнасці, а ў Маскве рэгулярна ладзіў канцэрты беларускай музыкі.

У айчынным кінамастацтве ваеннай пары на першы план, вядома, выйшла кінахроніка. Першым кінафільмам гэтага часу стаў выдадзены ў 1942 годзе рэжысёрамі Ю.Тарычам і В.Корш-Саблiным "Беларускі кіназборнік". З другой паловы гэтага года ў Маскве, на базе Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў, групай беларускіх кінематаграфістаў кожны месяц выходзіў кіначасопіс "Савецкая Беларусь". У 1943 годзе там выдалі фільм-канцэрт "Жыві, родная Беларусь!", а ў 1944-м — дакументальны поўнаметражны фільм "Вызваленне Савецкай Беларусі". Многія каштоўныя кадры ваеннай пары былі зняты беларускімі аператарамі М.Беравым, В.Цеслюком, С.Школьнікавым, М.Сухавай і А.Рэйзман. Дзесяткі разоў здымаў на фронце, тройчы лятаў у размяшчэнне партызанскіх атрадаў І. Вейняровіч.

У жанрах плаката, карыкатуры, сатырычнага малюнка працавалі мастакі І.Ахрэмчык, П.Гаўрыленка, Я.Зайцаў і іншыя. З першых дзён вайны пачалі выходзіць газета-плакат "Раздавім фашысцкую гадзіну!" і сатырычнае выданне "Партызанская дубінка". Беларускія мастакі бралі ўдзел у выстаўках, якія арганізоўваліся творчымі саюзамі савецкіх рэспублік. Напрыклад, у 1941 годзе яны ўдзельнічалі ў выстаўцы "Мастакі Куйбышава ў дні Вялікай Айчыннай вайны", у 1942-м — у аналагічных выстаўках творцаў з Сібіры і Свярдлоўска.

Значнай падзеяй сталася Усесаюзная мастацкая выстаўка "Вялікая Айчынная вайна". Па яе выніках Заір Азгур быў узнагароджаны дыпломам І ступені, скульптар А.Грубэ атрымаў дыплом ІІ-й. У 1944 годзе ў залах Траццякоўскай галерэі адбылася мастацкая выстаўка, прысвечаная 25-годдзю БССР. Прадстаўленыя на ёй творы паклалі пачатак аднаўленню фондаў Беларускай дзяржаўнай карцінай галерэі.

**Аляксандр ПАЦЫЕНКА,**
**дацэнт БДУКіМ,**
**кандыдат педагагічных навук**

з 23 мая

# АК Афіша "К"

да 30 мая 2009

## МУЗЕІ *

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РБ

*г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 227 45 62.*

- Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
- Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пачатку XX стст.
- Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.
- Выстаўка фотаграфіі **"Схаваная Японія" Кідзюра Яхагі**.
- Выстаўка **"Традыцыйнае мастацтва Карэі"**.
- Выстаўка **"Алтарны жывапіс XVIII — XIX стст."**.
- Выстаўка дзіцячага малюнка **"На сваёй зямлі"**.
- Выстаўка П.Асоўскага **"Рамантыка славянскіх земляў"**.

*Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея РБ:*

### МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст.".

*г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.*

- Выстаўка фотаздымкаў XIX ст.

### ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

*г.п. Мір, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. Тэл.: (8–01596) 2 30 35.*

### МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА ў в.Раўбічы

*Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі р-н. Тэл.: 507 44 68.*

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка дзіцячай творчасці.

### МУЗЕЙ ВІТОЛЬДА КАЭТАНАВІЧА БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ ў г.МАГІЛЁВЕ

*г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.*

- Пастаянная экспазіцыя.

## МУЗЕІ *

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

*г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.*

Экспазіцыі:

- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст.".**
- **"Старажытная Беларусь".**
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**

Выстаўкі:

- **"Гісторыя мастацтва Ірана".**
- **"Скарбніца мудрасці".**
- **"Невядомы Смаляк"** (персанальная выстаўка Андрэя Смаляка).
- **"Крыніцы адвечнай прыгажосці".**
- **"Касцярэзнае рамяство Беларусі"** (з фондаў Нацыянальнага музея гісторыі і культуры).

***Дом-музей I з'езда РСДРП***

*г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.*

- Пастаянная экспазіцыя

### МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

*г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.*

Экспазіцыі:

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:

- **"Трафеі вайны"** (да 65-годдзя вызвалення Беларусі).

Праект інтэрактыўнай карты:

**"Вызваленне Беларусі"** *(хроніка вызвалення і мультымедыйная прэзентацыя аперацый Чырвонай Арміі па вызваленні Беларусі ў верасні 1943 — ліпені 1944 гг.).*

### ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 72 61.*

Выстаўкі:

- Выстаўка, прысвечаная 85-годдзю А.Савіцкага.
- **"Хата — мой сусвет".**
- **"Жыццё Л.М. Талстога ў фатаграфіях сучаснікаў".**
- Выстаўка музейных прадметаў XI — XX стст. з фонду музея **"Вякоў мінулых успамін...".**

### ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

*г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.*

*Цэнтральная частка палаца Румянцавых і Паскевічаў*

Выстаўкі:

- **"Прыгажосць душы — рукачынная"** *(да 70-годдзя гомельскай фабрыкі "Любна").*

- **"Агнястрэльная і халодная зброя краін свету"** (выстаўка макетаў).
- **"Усмешка клоуна"** (з калекцыі М.Чалнакова).
- **"Нараджэнне і адраджэнне".**
- **"Аляксандр Гайлевіч. 20 гадоў творчасці".**
- Выстаўка работ сусветна вядомага куцюр'е **Вячаслава Зайцава**: карціны, фотаработы, мадэлі вопраткі.
- **"Пратакольныя падарункі".**

Экспазіцыі:

- **"Культавыя прадметы".**
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны".**
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** *(грот палаца).*
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.

*Вежа палаца Румянцавых і Паскевічаў*

Гісторыка-мемарыяльная экспазіцыя

- **"Гравюра XVII — пачатку XX стст.".**
- **"Паэзія XVIII — пачатку XX стст.".**

*Паўночнае крыло палаца*

Выстаўкі:

- **"У цэню дрэваў, над ракой"** *(фотаздымкі птушак і вавёрак Гомельскага парку фотааматара Яўгена Шастакова).*
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**
- Працуе куток жывых экзатычных рэптылій.

### ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

*г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.*

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Лакальныя экспазіцыі ў санітарным вагоне; у партызанскай зямлянцы.
- Пастаянная выстаўка ваеннай тэхнікі.
- На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
- У выставачнай зале: **"Афганістан: ты наша памяць і боль".**

## ГАЛЕРЭІ*

### ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

*г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.*

- **"Адзін дзень у Чэшскай Рэспубліцы".**
- **"Мастак і кніга".**

### МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

*г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.*

- **"Пункт гледжання".**

### ГАЛЕРЭЯ ТЫЗЕНГАУЗА

*г. Гродна, пл. Тызенгауза, 4. Тэл./факс: (8–0152) 72 27 57.*

- Выстаўка гродзенскіх мастакоў.

### КАРШІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Г.ВАШЧАНКІ

*г. Гомель, вул. Карповіча, 4. Тэл.: (8-0232) 77 75 20.*

Экспазіцыі:

- **"Г.Х. Вашчанка".**

Выстаўкі:

- Выстаўка **Васіля Шаранговіча.**
- Выстаўка плакатаў **Уладзіміра Цэслера і Сяргея Войчанкі** з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.
- Выстаўка экзатычных рыбак.

**Паважаныя чытачы!**

**на газету "Культура"**
**Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752;**

# ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА

**на часопіс "Мастацтва"**
**Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 74958, ведамасная падпіска — 749582.**

**НА II ПАЎГОДДЗЕ 2009 ГОДА!**

## ТЭАТРЫ*

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*г. Мінск, тэл./факс: 334 11 56.*

*(пл. Парыжскай каммуны, 1)*

- **24 — "Беласнежка і сем гномаў"** Б.Паўлоўскага.
- **24 — "Лебядзінае возера"** П.Чайкоўскага.
- **26 — "Канцэрт для фартэп'яна з аркестрам № 1"** П.Чайкоўскага.
- **26 — "Сімфонія № 2"** С.Рахманінава.
- **27 — "Карміна Бурана"** К.Орфа.
- **27 — "Балеро"** М.Равэля.
- **29 — "Спячая прыгажуня"** П.Чайкоўскага.

### РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

*г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. тэл./факс: 334 60 08.*

- **26 — "Вечар сучаснай харэаграфіі"** Д.Залескага, В.Скварцовай.
- **27 — "Ах, гэтыя вольныя матылькі!"** Л.Герша.
- **28 — "Планета"** Я.Грышкаўца.
- **29 — "Ігвіта, ці Як гэта рабілі ў Францыі"** Г.Фаміна.

### БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

*г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.*

- **22, 23 — "Жыў-быў Заяц"** М.Шувалава.
- **24, 26 — "Бука"** М.Супоніна.
- **27 — "Дапытлівы слонік"** Р.Кіплінга.
- **29 — "Яшчэ раз пра Чырвоны Каптурык"** С.Когана, С.Яфрэмава.

### МАЗЫРСКІ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР ІМЯ І.МЕЛЕЖА

*г. Мазыр, вул. Ленінская, 23. Тэл.: (8–02351) 211 31.*

- **28 — "Ён, яна, вакно, нябожчык"** Р.Куні.
- **28 — "Жаніцьба"** М.Гогаля.

**ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА**

Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 418**
**Галоўны рэдактар — Людміла КРУШЫНСКАЯ**

**Рэдакцыйная калегія:**
**Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Уладзімір ЗАМЯТАЛІН, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Аляксандр РАШЧУПКІН, Барыс СВЯТЛОЎ, Рычард СМОЛЬСКІ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.**

**Рэдакцыя:**
**Сяргей ТРАФІЛАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Пётр ОВАД (адказны сакратар).**

**Рэдактары аддзелаў:**
**Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілля СВІРЫН, Антон СІДАРЭНКА.**

**Спецкарэспандэнты:**
**Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Наталля КІРПІЧЭНКАВА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.**

**Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ**
**Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС**
**Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД**

**Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр.Незалежнасці,77. Тэлефон: (017) 289-34-66 (прыёмная) (017) 286-07-97, Тэлефон/факс: (017) 334-57-23 (017) 334-57-35. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334-57-41**

**www.kimpress.by**

**E-MAIL: kultura@tut.by**

Выдавец — **Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"**
**Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0131892 ад 27 снежня 2006 г.**

**220013, Мінск, пр.Незалежнасці, 77. Тэл. (017) 289-34-66. Бухгалтэрыя: тэл. (017) 334-57-35**

**Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца работы, зваротны адрас. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.**
***Матэрыял на правах рэкламы.**

**© "Культура", 2009.**
**Індэкс 63875**
**Наклад 9213**
**Падпісана ў свет 21.05.2009 у 18.15**
**Замова 2693**
**РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". 220013, г.Мінск, пр.Незалежнасці, 79**

ISSN 1994-4780